

БУДАВАЦЬ СВОЙ ДОМ МОЖНА БЕЗ ПРАЕКТА 2

МУЖЧЫНСКІ І ЖАНОЧЫ МОЗГ: ПАДАБЕНСТВА І РОЗНІЦА 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 ЧЭРВЕНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 114 (29736)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЦАЙ, намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:**

*«Сярэдні кошт у санаторна-курортных арганізацыях краіны ў першым квартале фактычна быў на ўзроўні снежня мінулага года і склаў 69,5 рубля за адзін дзень знаходжання ў стандартным аднапакаёвым двухмесным нумары. Чакаецца, што ў другім квартале кошт складзе 71,5 рубля. А на летнія месяцы з-за павышанага попыту на лячэбна-аздараўленчыя паслугі з боку спажыўцоў цана будзе прыкладна 72–75 рублёў. Што да гатэляў Турцыі, то там цана ў 3-4-зоркавых гатэлях роўная прыкладна 162 рублі, у Егіпце — каля 145 рублёў, гэта значыць, у два разы вышэйшая. І ў яе, падкрэслю, не ўваходзяць медыцынскія працэдуры».*

# Смачная адказная работа



Фота Віктара ДРАЧОВА.

Слонімскі мясакамбінат — адно з вядучых мясаперапрацоўчых прадпрыемстваў, прадукцыю якога ведаюць далёка за межамі нашай краіны. Смакавыя якасці мясных і каўбасных вырабаў поўнасцю залежаць ад працы супрацоўнікаў тэхналагічнага аддзела. Добрых спецыялістаў, здольных вызначыць, якія інгрэдыенты ў каўбасу неабходна дадаць, у галіне можна пералічыць на пальцах. Адзін з такіх спецыялістаў — галоўны тэхнолаг камбіната Людміла ЛУКАШЭВІЧ *(злева)*.

На здымку яна і фасоўшчыца каўбаснага цэха Вікторыя ТАКМАКОВА правяраюць якасць прадукцыі.

## КОРАТКА

• **Некаторыя тэхнічныя паверкі ў Беларусі будуць праводзіць у два разы радзей.**

• Васілёк як галоўны сімвал «Славянскага базару» загарыцца на Нацыянальнай бібліятэцы.

• **Тэст-сістэмы для выяўлення воспы малпаў распрацавалі ў Беларусі.**

• Гродзенскія студэнты-медыкі ўпершыню здаюць іспыт з элементамі АСКЭ.



Зварот у рэдакцыю

# ПЕРШЫ Ў ЧАРЗЕ

**Як атрымаць доўгачаканае жыллё?**

Унучка Галіны Фёдараўны ўжо шмат гадоў жыве разам з мужам і двума дзеткамі на здымнай кватэры. Клапатлівыя бацькі працуюць не складаючы рук — абы ў Мацюшы з Мірошам усё было самае лепшае. Хлопчыкі яшчэ і ў школу не ходзяць, а ў іх ужо у кожнага па новым смартфоне. Не кажучы пра самае моднае адзенне, цацкі, веласіпеды. Вось нядаўна купілі батут, заплацілі больш як 500 рублёў. У планах — на наступнае лета ўсталяваць на лецішчы драўляны дзіцячы комплекс з арэлямі, горкай, турнікамі, ужо нагледзелі прыгожанькі за тысячу рублёў. «Я не раз казала Алесьцы, што калі б так не раскідваліся грашыма, а адкладалі, даўно б ужо сваё жыллё пабудавалі. Паслухае-паківае і працягвае рабіць па-свойму...»



СТАР. 3

Фестываль

# ПАЛЁТЫ Ў КОСМАС, МАСТАЦТВА СУЧАСНАЙ ВЫЦІНАНКІ І ШМАТ МУЗЫКІ

## Чым здзівіла «Маладзечна-2022»

**У Маладзечне 10—11 чэрвеня прайшоў XXI Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі. У гэтым годзе форум упершыню адбыўся без яго ідэйнага натхняльніка, народнага артыста Беларусі Міхаіла Фінберга. Памяць легендарнага дырыжора ўшанавалі прэзентацыяй дакументальнай стужкі і выстаўкай, пра асобу маэстра. На фестывальных пляцоўках размясціліся экспазіцыі, прысвечаныя важным для гісторыі нашай краіны датам — 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, а таксама выстава «Памяць пакаленняў» да Года гістарычнай памяці. Аб тым, чым запомніўся першы дзень форуму, чытайце ў рэпартажы «Звязды».**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «РАСІЮ БУДУЦЬ ДУШЫЦЬ, А ЗААДНО — І НАС»

## Прэзідэнт правёў дзве нарады. Абедзве датычацца бяспекі, у тым ліку эканамічнай

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, дзяржсакратара Савета бяспекі і старшыню КДБ. Асноўная тэма — удасканаленне і развіццё Камітэта дзяржаўнай бяспекі.**

«Ясна, што сітуацыя ўскладнілася ў свеце, спецслужбы з кожным годам набываюць усё большае значэнне для дзейнасці той ці іншай дзяржавы. Ды ўжо і нашы людзі ўбачылі ролю і месца КДБ у структуры сілавых органаў і бяспекі нашай дзяржавы. Апошнім часам актывізаваўся камітэт. І мы заўважылі, што нам не трэба нейкіх лёгкіх змяненняў Камітэта дзяржбяспекі. Але да традыцыйных мерапрыемстваў, якія яны праводзяць, традыцыйных функцый, задач, якія яны вырашаюць, нам трэба ў адпаведнасці з часам дадаваць якія-небудзь іншыя функцыі. Узмацняць, можа быць, існуючыя. Я маю на ўвазе разведку, контрразведку, абарону канстытуцыйнага ладу і гэтак далей, антытэрарыстычную дзейнасць. Гэта ў любой краіне хлеб спецслужбаў падобнага роду. Дзесяці, магчыма, ствараць і новыя. Асабліва з прычыны той інфармацыйнай бяспекі, якая павінна быць у краіне, і той гібрыднай вайны, якая разгорнута не толькі супраць Беларусі. Яна па ўсім свеце ўжо існуе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт заўважыў, што апошнім часам, асабліва пасля прэзідэнцкіх выбараў, нямала зроблена па рэфармаванні і ўдасканаленні дзейнасці ўсіх сілавых структур у Беларусі.

«Што датычыцца Міністэрства абароны, мы, напэўна, ужо некалькі разоў падыходзілі да ўдасканалення дзейнасці нашай арміі. Гэта натуральна. У залежнасці ад таго, як развіваюцца падзеі, якая будучая вайна, калі, не дай божа, яна будзе, і гэтак далей. У агульным прычын вельмі шмат. І, напэўна, разоў пяць мы істотна ўдасканалілі структуру і дзейнасць нашай арміі», — прывёў прыклад Прэзідэнт.

Аналагічна прымалася рашэнне па МНС. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, гэта рашэнне сур'ёзнае і надоўга. Але, калі будзе трэба, — да яго яшчэ раз вернуцца. «Пагранічныя нашы войскі. Напэўна, аптымальная структура. Яна ўлічвае вопыт і савецкага перыяду часу, і тую сітуацыю, якая вакол нас», — прывёў яшчэ адзін прыклад кіраўнік дзяржавы.

### ТАВАР ТРЭБА ПАКАЗВАЦЬ ТВАРАМ

**Таксама ў панядзелак на нарадзе ў Прэзідэнта абмяркавалі пытанні ўдасканалення рэкламна-выставачнай дзейнасці і работу беларускага павільёна на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве.**

«Як вам вядома, існуючая сітуацыя вакол Беларусі, асабліва ў сферы эканомікі, дыктуе асаблівую актуальнасць, і пэўныя нестандартныя дзеянні патрабуюцца ў сувязі з гэтым. Ясна, што ў дадзенай сітуацыі асноўным нашым партнёрам, як і было раней, стала Расійская Федэрацыя. Рабоце на расійскім рынку мы надаём асаблівае значэнне, гэта таксама ні для кога не з'яўляецца сакрэтам. Таму мабілізоўваюцца ва ўрадзе (калі не, то павінны) усе рэсурсы для таго, каб эфектыўна дзейнічаць на ўсходнім напрамку. Гэта не значыць, што мы павінны забыць іншыя рынкі — і краін, якія развіваюцца, і традыцыйныя нашы рынкі Еўрапейскага саюза, Злучаных Штатаў Амерыкі. Але пакуль мы не можам там працаваць так эфектыўна, як працавалі да пакетаў санкцый. Цяпер зразумела, Расію будуць душыць, а заадно — і нас, каб, як я ўжо казаў, і яны кажуць пра гэта адкрыта, Расія не змагла абысці санкцыі праз Беларусь», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, у сувязі з гэтым расійскаму напрамку ўдзяляецца асаблівая ўвага. І ў гэтым плане вялікае значэнне мае наша рэкламна-выставачная дзейнасць. «Тавар трэба паказваць тварам, яго трэба рэкламаваць. А для таго, каб рэкламаваць, трэба выстаўляцца», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што беларускі павільён на ВДНГ значны ў тым плане, што яшчэ ў часы Барыса Ельцына Аляксандр Лукашэнка разам з Нурсултанам Назарбаевым паставілі пытанне перад Расіяй, каб ВДНГ было як у Савецкім Саюзе, каб там былі прадстаўлены ўсе рэспублікі. «У сілу гэтай актуальнасці мной была звернута ўвага на работу гэтага павільёна. Я атрымаў інфармацыю, быццам усё добра, з прыбыткам працуем і іншае», — сказаў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што яму важна, каб беларускі павільён быў прыбытковым: «Там павінны быць выстаўлены для рэкламы нашы прадукты, якія мы вырабляем: ад прадуктаў харчавання да тэхнікі, і рэалізаваныя, наколькі гэта магчыма. А таксама заключаны кантракты. Эфектыўнасць павінна быць у гэтага беларускага цэнтра, за які я змагаюся», — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

❍ **Каментарый у тэму**

### ГЭТА ПАВІННА БЫЦЬ ЯРКАЯ КАРЦІНКА ТАГО, ШТО СЁННЯ ЎЯЎЛЯЕ З СЯБЕ БЕЛАРУСЬ

Пасля нарады першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў расказаў журналістам, якія даручэнні паставіў кіраўнік дзяржавы і як яны будуць выконвацца.

«Прэзідэнт звярнуў увагу на пашырэнне кірмашова-выставачнай дзейнасці беларускай прадукцыі за мяжой. Натуральна, у Расіі на плошчах выставачнага павільёна на ВДНГ. Прэзідэнт адзначыў, што адпаведныя рашэнні ім былі прыняты ўжо даўно да таго, каб замацаваць гэты павільён за Беларуссю і зрабіць з яго яркую, маляўнічую вітрыну ўсяго таго, што вырабляецца ў нашай краіне. Па задуме Прэзідэнта, акрамя кірмашова-выставачнай дзейнасці, асноўнае месца там павінна займаць прэзентацыя палітычнага, культурнага, сацыяльнага жыцця ў нашай краіне. Значыць, гэта павінна быць яркая карцінка таго, што сёння ўяўляе з сябе Беларусь — звернутая ў будучыню, яркая, сучасная, інтэрнэтам насычаная, маладая, дынамічная. І яна павінна ствараць адпаведнае ўражанне ў гасцей павільёна і гасцей сталіцы нашага найбліжэйшага партнёра Расіі», — расказаў ён.

Паводле слоў Максіма Рыжанкова, гэтая задача пастаўлена даўно, і абнаўленне беларускай экспазіцыі магло б завяршыцца раней. Але невялікая паваротлівасць адпаведных службаў прывяла да таго, што Прэзідэнту прыйшлося асабіста ўзяць пад кантроль гэтае пытанне, абазначыць сваё бачанне гэтага праекта.

«Пастаўлены канкрэтныя тэрміны. Яны вельмі акрэсленыя, кароткія, але магчымыя для выканання, гэта было пацверджана ўсімі ўдзельнікамі нарады. Да 1 верасня плануецца значна абнавіць гандлёвы шэраг прадстаўленай прадукцыі, у першую чаргу насыціць яе прадукцыяй нашых флагманаў — легпрама, харчпрама. Даць другое дыханне нашай экспазіцыі. І ўжо да канца года рэалізаваць поўны пакет мерапрыемстваў, якія датычацца прэзентацыйнай часткі павільёна. Каб кожны чалавек, заходзячы туды, бачыў не гандлёвы павільён, а павільён Рэспублікі Беларусь — суверэннай дзяржавы, якая дынамічна развіваецца і мае ўсе кампетэнцыі і магчымасці для вытворчасці самай высакаякаснай прадукцыі па самым шырокім спектры», — расказаў Максім Рыжанкоў.

# ТОЛЬКІ БУДУЙЦЕСЯ!

**У Беларусі спрошчаны парадак узвядзення і рэканструкцыі аднакватэрных жылых дамоў і гаспадарчых пабудоў. Адпаведны ўказ № 202 падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.**

### АД ЯКОЙ ПАПЯРОВАЙ ЦЯГАНІНЫ ВЫЗВАЛЯЕ ЎКАЗ?

Дакументам прадугледжана, што такія аб'екты можна будзе пабудаваць без атрымання дазволаў, без распрацоўкі праектнай дакументацыі і без наступнай прыёмкі іх у эксплуатацыю.

### ПАБУДАВАЦЬ ДОМ У ВЁСЦЫ? ПАТРЭБЕН ТОЛЬКІ ДАКУМЕНТ НА ЗЯМЛЮ

Для будаўніцтва або рэканструкцыі аднакватэрных жылых дамоў і гаспадарчых пабудоў у сельскіх населеных пунктах (за выключэннем размешчаных на тэрыторыі раёнаў, прылеглых да абласных цэнтраў і Мінска) грамадзянам дастаткова мець дакумент, які сведчыць правa на зямельны ўчастак.

### ПАБУДАВАЦЬ ДОМ ПАБЛІЗУ АД МІНСКА І АБЛАСНЫХ ЦЭНТРАЎ? ПАТРЭБЕН ПАШПАРТ ЗАБУДОЎШЧЫКА

Для ўзвядзення такіх пабудоў у сельскіх населеных пунктах, размешчаных на тэрыторыі раёнаў, прылеглых да абласных цэнтраў і Мінска, у пасёлках гарадскога тыпу і гарадах грамадзяніну неабходна будзе атрымаць пашпарт забудоўшчыка. На падставе такога пашпарта змогуць пабудаваць жылыя аднакватэрныя дамы таксама і юрыдычныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі.

### ЯК АТРЫМАЦЬ ПАШПАРТ ЗАБУДОЎШЧЫКА?

Выдача пашпарта забудоўшчыка будзе ажыццяўляцца па прынцыпе «адно акно», тэрмін афармлення — адзін месяц, кошт — 25 базавых велічынь (адна базавая велічыня — Br32).

Таксама ўказам прадугледжаны спрошчаны парадак дзяржаўнай рэгістрацыі пабудаваных такім чынам аб'ектаў.

### А ЦІ МОЖНА БУДАВАЦЬ, ЯК РАНЕЙ?

Дзеючы парадак узвядзення і рэканструкцыі аднакватэрных жылых дамоў і гаспадарчых пабудоў (з атрыманнем усіх дазволаў, узгадненняў, заключэнняў і распрацоўкай праекта) таксама захоўваецца.

### СПРОШЧАНЫ ПАРАДАК УСЮДЫ, АКРАМЯ МІНСКА

Рашэнне аб прымяненні спрошчанага парадку прымаецца забудоўшчыкамі самастойна. Скарыстаць такі парадак можна будзе пры ўзвядзенні аб'ектаў на тэрыторыі ўсёй краіны, за выключэннем Мінска.

### КАЛІ ПАЧНЕ ДЗЕЙНІЧАЦЬ УКАЗ І НАВОШТА ЁН ПРЫНЯТЫ?

Указ уступае ў сілу праз 6 месяцаў пасля апублікавання.

* * *

Аб планах па прыняцці такога дакумента для спрашчэння будаўніцтва прыватных дамоў Прэзідэнт заяўляў раней. «Слухайце, што мы лезем да гэтага чалавека, чаго мы спрабуем яго неяк адбудаваць: які дах, які падмурак і гэтак далей? Чалавек для сябе будуе, і ён за гэта адкажа перад сабой, сваімі дзецьмі. Давайце яму адзін раз дазволім, выдзелім месца, дзе ён павінен будаваць, і няхай ён будуе. Ён сам да вас прыйдзе, спытае парады, калі трэба. Калі не трэба, ён да вас не пойдзе, — растлумачыў кіраўнік дзяржавы неабходнасць спрашчэння працэдуры і прыняцця ўказа на нарадзе 10 чэрвеня. — І не дай бог, вы абставіце яго нейкімі інструкцыямі. Гэта недапушчальна».

Прэзідэнт таксама анансаваў аналагічныя крокі па спрашчэнні будаўніцтва шматпавярховых будынкаў, прамысловых, сельскагаспадарчых аб'ектаў і гэтак далей: «Трэба даць магчымасць людзям вырашаць свой лёс і не трэба думаць, што мы лепш разумеем, чаго хоча чалавек, чым ён сам. Простая жыццёвая філасофія».

**Паводле БелТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Саміт Амерык прадэманстраваў, што ў ЗША няшмат партнёраў у рэгіёне



Саміт Амерык паказаў, што ў Злучаных Штатаў не так шмат рэгіянальных партнёраў, а адсутнасць шэрагу краін на форуме кідае адкрыты выклік «гегемону». Такое меркаванне выказаў аглядальнік інфармацыйнага партала Axios Дэйв Лоўлер. Эксперт падкрэсліў, што на форум не былі запрошаны «аўтарытарныя лідары» Венесуэлы, Кубы і Нікарагуа. Акрамя таго, мерапрыемства байкатавалі прэзідэнт Мексікі і «іншыя левыя лідары» — з Балівіі і Гандураса. Таксама на саміце не было прэзідэнтаў Гватэмалы і Сальвадора. Паводле ацэнкі аўтара, адсутнасць шэрагу лацінаамерыканскіх лідараў «падарвала» намаганні адміністрацыі Байдэна па вырашэнні актуальных пытанняў, у прыватнасці пераадоленні праблем з міграцыяй у рэгіёне.

### У Францыі блок «Разам!» усяго на 0,1 % абышоў саюз левых

Па выніках апрацоўкі ўсіх бюлетэняў, кіруючая кааліцыя «Разам!» атрымала 25,7 працэнта, кааліцыя левых сіл «Новы народны экалагічны і сацыяльны саюз» — 25,6 працэнта, паведаміла ТАСС. Далей з 18,7 працэнта галасоў ідзе «Нацыянальнае аб'яднанне» пад старшынствам Марын Ле Пэн, якая раней удзельнічала ў прэзідэнцкіх выбарах у Францыі. Адзначаецца, што галасаванне не выклікала цікавасці ў французаў, больш за палову (52,5 працэнта) грамадзян, якія маюць права голасу, не наведалі выбарчыя ўчасткі. Такім чынам, яўка ў першым туры стала самай нізкай у гісторыі краіны. Мінулыя парламенцкія выбары таксама праходзілі пры невысокай яўцы. Эксперты адзначаюць, што гэтая з'ява становіцца трэндам для грамадска-палітычнага жыцця Францыі.

### У Чэхіі гадавая інфляцыя дасягнула максімальнага значэння за апошнія 30 гадоў

Гадавая інфляцыя ў Чэхіі ў маі склала 16 працэнтаў, паведаміла ТАСС са спасылкай на Чэшскае статыстычнае ўпраўленне. Адзначаецца, што гэта найгоршы паказчык з канца 1993-га, калі гадавая інфляцыя была 18,2 працэнта. Прычым адзначаецца рост — сёлета ў красавіку інфляцыя склала 14,2 працэнта. Удакладняецца, што ў Чэхіі мацней за ўсё вырас кошт прадуктаў харчавання і жыллёва-камунальных паслуг. Пры гэтым скачок цэн на тавары быў выкліканы падаражэннем электрычнасці і прыроднага газу. Так, у гадавым вылічэнні ў маі цэны на прыродны газ павялічыліся на 49,2 працэнта, а на электрычнасць — на 30,8 працэнта. На думку аналітыкаў, не выключаецца магчымасць далейшага пагаршэння эканамічных паказчыкаў.

Векапомнае

# АДЗІНЫМ ФРОНТАМ ЗАХАВАЕМ ПАМЯЦЬ

У Мінску пачынае работу міжнародная парламенцкая канферэнцыя «Гістарычная памяць: Вялікая Перамога, здабытая адзінствам»


Фота БелТА.

**Форум, прымеркаваны да 81-й гадавіны пачатку Вялікай Айчыннай вайны, праходзіць пад эгідай Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. У беларускую сталіцу прыбылі парламенцкія дэлегацыі з Арменіі, Казахстана, Расійскай Федэрацыі, Таджыкістана і Узбекістана. Таксама ў канферэнцыі возьмуць удзел прадстаўнікі Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД, Парламенцкай асамблеі АДКБ, Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі, Выканкама СНД, дзяржаўных органаў, навуковыя супрацоўнікі і эксперты.**

Канферэнцыя праводзіцца з мэтай аб'яднання намаганняў міжнароднай супольнасці па абароне гістарычнай памяці, абмену вопытам у галіне заканадаўчага рэгулявання пытанняў недапушчэння рэабілітацыі нацызму, гераізацыі нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых, узмацнення міжпарламенцкага ўзаемадзеяння на прасторы СНД па супрацьдзеянні фальсіфікацыі гістарычнай праўды і памяці аб падзеях Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Перш чым прыступіць да работы, парламенцкія дэлегацыі возьмуць удзел у цырымоніі ўскладання вянка і кветак да манумента Перамогі. Затым дэлегаты наведаюць мемарыяльны комплекс «Храм — помнік у гонар Усіх Святых», у крыпце якога захоўваюцца капсулы з зямлёй з месцаў пахавання беларусаў, якія ў тым ліку загінулі ў лагеры смерці «Трасцянец», у баях на Курскай дузе, вызваляючы Еўропу ад фашызму...

Сваім кампетэнтным меркаваннем аб падзеях Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, а таксама навуковымі распрацоўкамі, канкрэтнымі прыкладамі ўвекавечвання памяці абаронцаў Айчыны, рэальнымі дзеяннямі па недапушчэнні фальсіфікацыі гісторыі і рэабілітацыі нацызму ўдзельнікі канферэнцыі падзеляцца падчас тэматычных секцый: «Вялікая Айчынная вайна ў сучаснай гістарыяграфіі», «Святы абавязак жывых», «Злачынствы без тэрміну даўнасці», «Гістарычная памяць. Нітка, якая звязвае пакаленні», «Вялікая Перамога ў грамадска-медыйным ракурсе».

Скончыцца першы дзень работы канферэнцыі малітвай-рэквіемам у памяць аб ахвярах генацыду «Не зарасце народная сцежка» ў мемарыяльным комплексе «Хатынь». Заўтра адбудзецца пленарнае пасяджэнне «Гістарычная памяць: Вялікая Перамога, здабытая адзінствам», падчас якога будзе прынята выніковая рэзалюцыя канферэнцыі.

**Вераніка КАНЮТА.**

Арыенціры

# ЗМЯНІЦЬ СТРАТЭГІЮ ПРЫСУТНАСЦІ

## Адгрузкі ў Расію беларускіх тавараў лёгкай прамысловасці істотна выраслі

**Тавары беларускай лёгкай прамысловасці будуць больш актыўна выходзіць на рынкі Расіі, у прыватнасці ў такія гарады, як Новасібірск, Екацярынбург, Барнаул, Іркуцк. Гэта дазволіць прадпрыемствам пераарыентаваць экспарт. Адгрузкі ў рэгіёны Расіі ідуць ужо больш актыўна, чым летась: за чатыры месяцы іх рост складае 15—28 %.**

Як расказала **старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА**, у 2021 годзе беларуская лёгкая прамысловасць спрацавала добра: аб'ём вытворчасці склаў 110 %, экспарт — 120 %, прадпрыемствы атрымалі 202 мільёны рублёў прыбытку. Сёлета стратэгія прысутнасці на рынках тых ці іншых краін змянілася.


Фота БелТА.

— Рынак Украіны, Заходняй Еўропы, Амерыкі займаў немалую долю ў нашым экспарце — каля 22 %. У прыватнасці, рынак Украіны складаў 12 %. Цяпер стаіць задача па замяшчэнні іх іншымі рынкамі. І дарожныя карты, падпісаныя летась з Расіяй, адыгрываюць сваю ролю ў хуткасці наладжвання бізнес-працэсаў. Найперш мы разглядаем Заўралле — як рэгіён, дзе нашы прадпрыемствы маглі бы быць лепш прадстаўлены, хоць з-за складанай лагістыкі і прысутнасці там кітайскага і турэцкага тавару гэта няпроста. У нашых прадпрыемстваў быў вопыт работы ў гэтым рэгіёне. Аднак апошнія 10-15 гадоў там было прадстаўлена 6-7 прадпрыемстваў — у розанічным гандлі гэта, як правіла, «Мілавіца», «Контэ», «Белвест», «Марка», «Марк Фармэль». Цяпер неабходна прыбываць масава брэндамі, каб гэта былі нашы аптовыя цэнтры і мы іх самі кантралявалі. Гэта мусіць быць 12-14 прадпрыемстваў у адным пункце, — расказала Таццяна Лугіна.

Акрамя таго, як адзначыла старшыня канцэрна, на рынках Казахстана, Арменіі, Азербайджана таксама ёсць нішы, якія могуць заняць беларускія тавары.

— Рынак Кітая яшчэ не адкрыўся пасля лакдаўну, але мы таксама бачым задачу: акрамя сыравіннага складніка, уваход на яго з нейкай сваёй, беларускай гісторыяй, — расказала Таццяна Лугіна.

Што датычыцца санкцый, якія паўплывалі на рамонт і абнаўленне вытворчага абсталявання (а яно на шэрагу прадпрыемстваў еўрапейскае), то большасць праблем вырашана.

— Пастаўкі наладжваюцца, магчыма, не так хутка, як раней, бо з'яўляюцца дадатковыя ланцужкі ў лагістыцы, але, як паказаў вопыт, усё можна вырашыць. Пакуль у нас пытанне толькі з заменай украінскай гліны, з якой працуе Добрушскі фарфоравы завод. Усе 16 узораў, якія мы атрымалі з паўднёвых рэгіёнаў Расіі, з Турцыі, Узбекістана, не маюць той белізны, якая нам неабходная. Але мы над гэтым працуем, — расказала старшыня канцэрна.

Пры гэтым яна падкрэсліла, што сітуацыя прымусіла выявіць шэраг пазіцый для імпартазамяшчэння:

— Кожны месяц на «Віцебскія дываны» мы завозілі з Саудаўскай Аравіі 12 фур грунтовай тканіны — гэта вялікія аб'ёмы. Прааналізавалі, што перашкаджае нам яе выраблядь, і высветлілася, што ўся справа толькі ў шырыні ткацкага станка. Працуем над тым, каб паставіць неабходнае абсталяванне і выраблядь яе ў сябе.

У краіне працуе каля 2 тысяч прадпрыемстваў, якія вырабляюць тавары лёгкай прамысловасці, з іх 54 уваходзяць у склад канцэрна «Беллегпрам». Штогод на экспарт яны пастаўляюць прадукцыі на 1 мільярд 800 мільёнаў долараў, з іх канцэрнаўскія прадпрыемствы — на 500 мільёнаў. У галіне лёгкай прамысловасці занята каля 55 тысяч работнікаў, 80 % з іх — жанчыны. Летась прадпрыемствы лёгкай прамысловасці на аднаго беларуса выраблілі 15 $м^2$ тканіны, 2,3 м дывановых вырабаў, 16 пар панчох і шкарпэтак, адну пару абутку.

— Лёгкая прамысловасць займае 1,2 % ВУП. І не ў кожнай краіне дзяржава ўдзяляе ёй столькі ўвагі. У нас дзякуючы ўвазе кіраўніка дзяржавы і ўрада гэта галіна развіваецца. Ніводнае прадпрыемства не спынілася, — падкрэсліла Таццяна Лугіна.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ПЕРШЫ Ў ЧАРЗЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але не толькі маладыя сем'і хвалюе жыллёвае пытанне. У прыватнасці, да нас у рэдакцыю звярнуўся Віктар Шасцюк з вёскі Раз'езд Фалічы Старадарожскага раёна. Мужчына піша, што стаіць у чарзе на атрыманне жылля як ветэран баявых дзеянняў з 1991 года. Зараз у спісе яго прозвішча значыцца пад нумарам 1. «Але, — скардзіцца Віктар Іванавіч, — ніхто мне нічога не выдзяляе. Скажыце, ці можна ў нашай краіне атрымаць абяцанае дзяржавай?»

## «ХОЧА, КАБ ВЫДЗЕЛІЛІ САЦЫЯЛЬНАЕ ЖЫЛЛЁ, АЛЕ...»

Па каментарый я звярнулася да **начальніка аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Слуцкага райвыканкама Веранікі ТРУНОВАЙ**. Паводле яе слоў, Віктар Шасцюк, які пражывае ў Старадарожскім раёне, мае слуцкую рэгістрацыю. І сапраўды разам з сям'ёй (сам, былая жонка і сын) стаіць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у Слуцкім райвыканкаме з 3 жніўня 1991 года па агульным спісе. Нумар яго чаргі — 31. Акрамя таго, мужчына ўключаны ў асобны спіс уліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў — «ветэраны баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў», нумар чаргі 1. Дарэчы, адсочваць прасоўванне чаргі можна



на афіцыйным сайце Слуцкага райвыканкама (https://gorod.gov.by/och_jil/slutsk/).

«Віктару Шасцюку неаднаразова прапаноўвалі будавацца, але ад гэтых прапаноў ён пастаянна адмаўляўся, — распавядае Вераніка Трунова. — У прыватнасці, у 2005 годзе яму прадставілі зямельны ўчастак для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, аднак, спасылаючыся на адсутнасць грашовых сродкаў, ён нават не змог аплаціць выраб праектна-каштарыснай дакументацыі. У выніку, паколькі Віктар Іванавіч не прыступіў да будаўніцтва, участак у яго забралі. У 2007 годзе мужчына выказаў жаданне будаваць 2-пакаёвую кватэру ў Слуцку. Рашэннем райвыканкама яго зацвердзілі членам жыллёва-будаўнічага вытворчага кааператыву. Аднак за сістэматычнае неўнясенне грашовых сродкаў на фінансаванне будаўніцтва кватэры рашэннем агульнага сходу забудоўшчыкаў яго выключылі з арганізацыі».

І зараз Віктару Шасцюку, паколькі ён стаіць першым у чарзе як ветэран баявых дзеянняў, прапаноўваюць будавацца. Але мужчына адмаўляецца. Бо ў прынцыпе яму прыйдзецца будаваць кватэру цалкам за свой кошт. Тым больш што склад сям'і з моманту пастаноўкі на чаргу змяніўся: з жонкай Віктар Іванавіч развёўся, сын ужо паўналетні. Плюс у мужчыны ва ўласнасці ёсць нерухомасць — дом у Старадарожскім раёне, дзе ён і жыве. Таму на нейкую субсідыю разлічваць таксама не даводзіцца.

Наколькі я зразумела, Віктар Іванавіч хоча, каб яму далі сацыяльнае жыллё (яго, дарэчы, нельга з часам выкупіць у дзяржавы). І ў прынцыпе, як ветэран баявых дзеянняў, ён меў бы на яго поўнае права, калі б не...

«Згодна з дзеючым заканадаўствам, мы, на жаль, не можам уключыць Віктара Шасцюка ў спіс прэтэндэнтаў на сацыяльнае жыллё, бо ён не праходзіць па даходах, — кажа Вераніка Трунова. — У мужчыны добрая пенсія. Яна на сёння перавышае зацверджаны бюджэт пражытачнага мінімуму. Калі б яна была меншая за бюджэт пражытачнага мінімуму, мы б адразу ўключылі ветэрана ў спіс прэтэндэнтаў на сацыяльнае жыллё. Неаднаразова яму пра гэта казалі, падрабязна ўсё тлумачылі. Але чалавек не хоча слухаць ні пра які закон. Кажа: «Я ветэран, мне павінны аказаць дапамогу, і ўсё тут».

Для Віктара Шасцюка, як высветлілася, у Слуцкім райвыканкаме заведзена асобная тоўстая папка. Вераніка Трунова падняла ўсе яго звароты за апошнія 14 гадоў.

«Ведаеце, куды ён толькі ні скардзіўся па гэтым пытанні пачынаючы з 2007 года: і ў Мінскі абласны выканаўчы камітэт пісаў, і ў Міністэрства замежных спраў, і ў суд (рашэннямі суда Слуцкага раёна ад 2011 і ад 2012 года Віктару Шасцюку адмоўлена ў праве на льготнае забеспячэнне жылым памяшканнем. Пастановай судовай калегіі па грамадзянскіх справах Мінскага абласнога суда дадзеныя рашэнні пакінутыя без змяненняў). Нават дзяржкантроль займаўся праверкай па яго пытанні. Чалавек, як кажуць, ужо прайшоў і агонь, і ваду... Вось зараз зноў актывізаваўся. Ужо па якім разе піша ва ўсе ведамствы, і мы ўсім даём адны і тыя ж адказы. Калі б была такая заканадаўчая магчымасць, мы б абавязкова аказалі Віктару Іванавічу дзяржпадтрымку. Але на сёння права на атрыманне сацыяльнага жылля напрамую звязана з узроўнем даходаў чалавека».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Шаноўныя чытачы, калі і ў вас ёсць пытанні, якія хвалююць, пішыце! Паспрабуем разабрацца ў праблемнай сітуацыі разам. Наш паштовы адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а; электронны адрас для зваротаў — zvarot@zviazda.by.

У цэнтры ўвагі

# ПАЧУЦЬ АДНО АДНАГО

## Як грамадскія арганізацыі дапамагаюць у кансалідацыі грамадства?

**Сацыяльныя гарантыі для маладых людзей на іх першым працоўным месцы неабходна ўзмацніць. Такое меркаванне выказаў старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА на пленарным пасяджэнні рэспубліканскага семінара-нарады «Актуалізацыя метадаў і форм работы з насельніцтвам на мясцовым узроўні».**

### ЛІКВІДАВАЦЬ ДЫСКРЫМІНАЦЫЮ

«Адно з найважнейшых пытанняў для развіцця любога рэгіёна — гэта прыцягненне і замацаванне моладзі. На жаль, мы бачым, што апошнім часам малады людзі часта не зацікаўлены ў тым, каб жыць і працаваць у невялікіх гарадах і ў сельскай мясцовасці, — адзначыў старшыня Федэрацыі прафсаюзаў. — Каб змяніць гэту тэндэнцыю, патрабуецца планамерная і пастаянная работа па ўсіх напрамках. Гэта датычыцца ўдасканалення заканадаўства, практыкі работы мясцовых органаў улады па паляпшэнні інфраструктуры і стварэнні ўмоў для матывацыі моладзі. Безумоўна, сваю ролю адыгрывае і работа грамадскіх арганізацый па падтрымцы і прасоўванні моладзі і яе ініцыятыў».

Для прафсаюзаў адзін з найважнейшых напрамкаў у гэтым пытанні — замацаванне дадатковых мер сацыяльна-эканамічнай падтрымкі моладзі праз пагадненні і калектыўныя дагаворы. Трэба адзначыць, што на сёння ў большасці выпадкаў калектыўныя дагаворы ўтрымліваюць дадатковыя працоўныя і сацыяльна-эканамічныя гарантыі: гэта самыя розныя нормы, дзякуючы якім маладыя работнікі атрымліваюць кампенсацыі за арэнду жылля або месца ў інтэрнаце, могуць разлічваць на матэрыяльную дапамогу ў выпадку нараджэння дзяцей, маюць дадатковыя гарантыі занятасці, выплаты і многае іншае. Усё гэта садзейнічае замацаванню моладзі на працоўных месцах.

Разам з тым практыка паказвае, што па асобных пытаннях для павышэння сацыяльнай абароненасці моладзі патрабуецца ўдасканаленне заканадаўства.

Міхаіл Орда згадаў пэўную дыскрымінацыю маладых работнікаў, якія прыйшлі на першае працоўнае месца не па размеркаванні. Размова ідзе аб сітуацыях, калі работнік у першыя паўгода працы вымушаны пайсці на бальнічны. Згодна з заканадаўствам, у гэты перыяд у работнікаў, якія маюць статус маладога спецыяліста, памер дапамогі па часовай непрацаздольнасці вызначаецца зыходзячы з сярэдняй заработнай платы. А маладыя работнікі, якія не маюць такога статусу, у першыя паўгода атрымліваюць дапамогу па часовай непрацаздольнасці ў мінімальным памеры — з разліку 50 працэнтаў бюджэту пражытачнага мінімуму.

«Прывяду канкрэтныя лічбы. Напрыклад, маладому работніку за 9 дзён бальнічнага ў маі ў суме будзе налічана толькі крыху больш за 45 рублёў. Гэта значыць, каля 5 рублёў за дзень. У такой жа сітуацыі дапамога маладога спецыяліста, які прыйшоў па размеркаванні, пры заработнай плаце 1000 рублёў складзе больш за 230 рублёў. Розніца ў пяць разоў, — падкрэсліў Міхаіл Орда. — І як гэтаму маладому чалавеку пражыць за 5 рублёў у дзень? Тым больш што ў маладых, як правіла, яшчэ няма ніякіх назапашванняў, і дапамагчы ім часта няма каму. Немалаважны тут і маральны аспект. Такі падыход дэматывуе маладых людзей».

Таму прафсаюзы настойваюць на тым, што неабходна на заканадаўчым узроўні ўстараніць такую няроўнасць у адносінах да маладых работнікаў.



Сярод іншых праблемных пытанняў старшыня ФПБ назваў недасканаласць практыкі ў перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі моладзі, нізкі ўзровень прэстыжу працоўных спецыяльнасцяў. Як вынік — дэфіцыт кадраў, асабліва ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. «Гэта вельмі сур'ёзная праблема. Таму на сёння мы дамовіліся з сацыяльнымі партнёрамі дэталёва абмеркаваць гэта пытанне на найбліжэйшым пасяджэнні Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, — праінфармаваў Міхаіл Орда. — Неабходна ўсім разам прааналізаваць, якія меры па ўдасканаленні прафесійнай падрыхтоўкі, узаемадзеянні прадпрыемстваў і навучальных устаноў, атрыманні дадатковых гарантый, павышэнні кваліфікацыі работнікаў і прэстыжу працоўных прафесій неабходна прыняць у найбліжэйшай і доўгатэрміновай перспектыве, каб змяніць гэтую тэндэнцыю».

### «ПРАВАДНІКІ» ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

«У нашай краіне захавалася эфектыўная сістэма работы маладзёжных грамадскіх арганізацый, якія ахопліваюць вялікую частку нашай моладзі, — падкрэсліў у сваім выступленні на семінары **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ**. — Узаемадзеянне з маладзёжнымі і дзіцячымі грамадскімі аб'яднаннямі, каардынацыю іх работы ажыццяўляюць Рэспубліканскі цэнтр сумесна з Беларускім камітэтам маладзёжных арганізацый. Мы можам смела канстатаваць, што пры падтрымцы дзяржавы моладзь можа знайсці сябе абсалютна ва ўсіх сферах, а грамадскія арганізацыі з'яўляюцца праваднікамі дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да нашай моладзі».



Фота БелТА.

Асноўнымі «праваднікамі» патрыятычнага выхавання ў маладзёжнае асяроддзе выступаюць Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, які аб'ядноўвае 342,5 тысячы хлопцаў і дзяўчат, і Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя, якая налічвае ў сваіх шэрагах каля 625 тысяч навучэнцаў.



З мэтай каардынацыі дзейнасці студэнтаў, узаемадзеяння з адміністрацыяй устаноў вышэйшай адукацыі і рэалізацыі студэнцкіх ініцыятыў у творчай і прафесійнай сферы былі створаны Грамадскі рэспубліканскі студэнцкі савет. У 2020 годзе пры Міністэрстве адукацыі быў створаны таксама Савет маладых вучоных, які з'яўляецца пастаянна дзеючым кансультатыўна-дарадчым органам пры ведамстве. На сёння з 11 тысяч маладых вучоных каля 2,5 тысячы з'яўляюцца кандыдатамі навук і каля 3 тысяч навучаюцца ў аспірантуры.

Уключэнне моладзі ў працэс вырашэння сацыяльных праблем грамадства, выхаванне ў яе пачуцця міласэрнасці і спачування і, вядома ж, патрыятызму, прадстаўлена валанцёрскім рухам, які з кожным годам пашыраецца. Агульная колькасць валанцёраў складае 57 950 чалавек, а колькасць валанцёрскіх атрадаў — 4335.

### СУСТРЭЧА НА ДЫЯЛОГАВАЙ ПЛЯЦОЎЦЫ

— Улічваючы рэаліі і выклікі сучаснага свету (пандэмія, палітычныя рознагалоссі на сусветнай арэне, крызіс сусветнай эканомікі і іншыя), трэба памятаць аб адной з галоўных функцый любой грамадскай арганізацыі — магчымасці для самарэалізацыі і атрымання так званай зваротнай сувязі. Пры акуратным, правільным падыходзе работа з насельніцтвам праз грамадскія арганізацыі з'яўляецца надзейным і дзейсным інструментам, — лічыць **першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ**. — Сімвалічна, што адзін з лозунгаў нашай арганізацыі — «Толькі разам і толькі наперад!»

У якасці кансалідуючага прыкладу можна прывесці работу дыялогавых пляцовак БРСМ рознага ўзроўню. Інфармаванне праз жывы дыялог дазваляе зняць сацыяльнае напружанне. Дыялогавыя пляцоўкі як спосаб зваротнай сувязі з насельніцтвам даюць магчымасць акумуляваць прапановы і ініцыятывы. Праект БРСМ «Адкрыты дыялог» з 2015 года збірае на дыялогавых пляцоўках моладзь, палітыкаў, лідараў меркаванняў, спартсменаў, прадстаўнікоў розных пакаленняў і г. д. Гэты фармат узаемадзеяння з насельніцтвам і ўцягванне яго ў абмеркаванне грамадска-значных тэм быў актыўна падхоплены і іншымі грамадскімі арганізацыямі. Адмысловую эфектыўнасць дыялогавыя пляцоўкі атрымалі падчас абмеркавання праекта Канстытуцыі ў бягучым годзе (было сабрана каля 9 тысяч прапаноў). Эфектыўная работа грамадскіх прыёмных, асабліва ў фармаце анлайн.

«Патрыятызм і гістарычная памяць — паняцці, якія сталі для нашай краіны жыццёва важнымі, — падкрэслівае Аляксандр Лук'янаў. — На нашых вачах усплываюць ачагі неанацызму, пагрозлівую тэндэнцыю набірае фальсіфікацыя гістарычнай праўды. У патрыятычным кірунку сёння павінны працаваць не толькі маладзёжныя арганізацыі, якія займаюцца захаваннем гістарычнай памяці, але і кожны праект, кожная добрая справа любой структуры павінна быць прасякнута гістарычнай памяццю. У тым ліку і ўсе валанцёрскія праекты і акцыі».

Прапанаваны БРСМ у Год моладзі і падтрыманы кіраўніком дзяржавы Рэспубліканскі патрыятычны праект «Кветкі Вялікай Перамогі» за сем гадоў перарос у сацыяльную акцыю, якая аб'ядноўвае штогод сотні тысяч людзей розных прафесій і ўзростаў па ўсёй краіне. Праект акумулюе сотні маладзёжных ініцыятыў. Адной з іх з'яўляецца альбом памяці «Беларусь памятае. Родныя твары Перамогі» і яго віртуальная версія. Галоўны слоган праекта — «Беларусь памятае. Памятаем кожнага».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

---

Раім схадзіць

# ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ

## Монакалясісты і аматары электрасамакатаў будуць выступаць у Дзень электратранспарту — 17 чэрвеня

**Як паведамілі ў прэс-службе Мінэнерга, у выставе пад адкрытым небам прыме ўдзел больш за 20 разнастайных кампаній. Чакаецца шырокае кола ўдзельнікаў: прадстаўнікі прамысловага комплексу, навуковых арганізацый, кампаній — імпарцёраў электрамабіляў. У іх ліку — «БКМ Холдынг», МАЗ, «Амкадор», «Беларуснафта», Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, «Мотавелазавод», «БелДжы», кампаніі Green cars, Tesla cars, Electro car, MultiMotors, Sidus Auto, Hello, Eleven, JET, E-power і іншыя.**



Фота neg.by

На выставе будуць прадстаўлены ўсе віды электратранспарту: ад легкавых электрамабіляў да электробусаў. Наведвальнікі змогуць убачыць апошнія мадэлі электраматацыклаў, электраскутараў і электравеласіпедаў. А яшчэ — новыя ўзоры электрагрузавіка, электрамінівэна, электраквадрацыкла айчыннай вытворчасці. Тут таксама будзе прадстаўлены мікраэлектрамабіль для бюджэтных перавозак. Ахвотныя змогуць даведацца аб развіцці сеткі зарадных станцый для электрамабіляў і перспектывах яе пашырэння.

Самае цікавае чакае на пляцоўцы аматараў электрасамакатаў, дзе будуць арганізаваны майстар-класы па правілах дарожнага руху. Праграмай мерапрыемства прадугледжаны выступленні монакалясістаў, там жа пройдуць конкурсы і розыгрышы.

Дзень электратранспарту праводзіцца штогод для папулярызацыі электрамабіляў як экалагічнага і эканамічнага віду транспарту, які садзейнічае фарміраванню камфортнага гарадскога асяроддзя. Арганізатарамі мерапрыемства выступаюць Міністэрства энергетыкі сумесна з Кітайска-Беларускім індустрыяльным паркам «Вялікі камень» пры садзейнічанні Мінгарвыканкама.

Выстава будзе працаваць у Мінску на пляцоўцы каля Нацыянальнай бібліятэкі з 11.00 да 14.00. Уваход свабодны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПАЛЁТЫ Ў КОСМАС, МАСТАЦТВА СУЧАСНАЙ ВЫЦІНАНКІ І ШМАТ МУЗЫКІ

## КАСМІЧНЫ ЧЭРВЕНЬ І ЯКУБ КОЛАС — ГРЫБНІК

У Маладзечна мы прыехалі да пачатку галоўных мерапрыемстваў — горад толькі прачынаўся. Прадаўцы раскладвалі тавар у шапіках, музыкі настройвалі інструменты, а жыхары і госці, знаёмячыся са святочнай абстаноўкай, няспешна шпацыравалі па цэнтральных вуліцах.

Адметнасць форуму ў гэтым годзе — экспазіцыя «Партал часу» да Года гістарычнай памяці, прадстаўленая рэгіёнамі Мінскай вобласці. Жодзіна, напрыклад, зладзіла інсталяцыю аб горадзе ў 50—60-х гадах мінулага стагоддзя. Манахромныя рэпартажныя фотаздымкі, агітплакаты, сцягі. Сімвалы таго часу — каваны падстаканнік, які ёсць у кожным цягніку, тэрмас, старыя шалі ды таблічка: «Заўсёды ў продажы: гарбата, кава, какава, кефір, запалкі, тытунь». Нясвіж вылучыўся сваімі старажытнымі традыцыямі: прыгожыя дамы, рыцары, высвятленне адносін паміж шляхцюкамі, прывіды замкаў і, канешне ж, музыка тых часоў. Прыцягнуў увагу і Чэрвень. На пляцоўцы пад назвай «Чэрвеньшчына: ад вытокаў да зор» можна было пагуляць у касмічны квэст і сфатаграфавацца з фігурай знакамітага ўраджэнца Чэрвеня касманаўта Алега Навіцкага.

У чаканні канцэртаў завіталі ў Мінскі абласны краязнаўчы музей, у ім размясціліся адразу дзве выставы. Першая, пад назвай «Дрэва жыцця», дэманстравала работы навучэнцаў Маладзечанскай школы выцінанкі. Работы прасякнуты фальклорнымі матывамі. Створаныя ў сучаснасці, яны вяртаюць да вобразаў мінулага, да традыцый. Наступная выстава, «Песняры роднага краю», прымеркавана да 140-годдзя з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры, Янкі Купалы і Якуба Коласа. У экспазіцыі прадстаўлены замалёўкі Сымона Геруса з серыі «Знаёмства з Якубам Коласам», работа Уладзіміра Пасюкевіча «Янка Купала і Цішка Гартны ў Капылі», а таксама фотаздымкі Якуба Коласа, якія паказваюць класіка падчас ягонага адпачынку — у грыбах, у гасцёўні дома ў Мінску, на беразе возера Нарач.



## ХЛОПЧЫК З ГУБНЫМ ГАРМОНІКАМ І ЛЕГЕНДА БЕЛАРУСКАЙ ЭСТРАДЫ

Надвор'е ў першы фестывальны дзень выпрабавала на трываласць кожнага госця форуму — спякота стаяла жудасная. Тым прыемней зайсці ў прахалодную залу кінатэатра «Радзіма». Там, на мой погляд, адбылася адна з галоўных падзей фестывалю — прэзентацыя дакументальнага фільма «Імправізацыя», прысвечанага памяці маэстра Міхаіла Фінберга.

Перад паказам слова ўзяла **заслужаная артыстка Беларусі Наталля ТАМЕЛА**:

— Фільм, які вы пабачыце, вельмі правільны — ён дакладна апісвае жыццё Міхаіла Якаўлевіча. Фінберг заўсёды прыходзіў на рэпетыцыю а палове восьмай, хоць пачыналася яна ў дзевяць. Нам нельга было спазняцца. Але калі раптам такое адбывалася і я тэлефанавала, каб папярэдзіць, ён казаў: «Дачушка, усё добра».



Гран-пры фестывалю атрымала Ганна РЫБАКОВА.





(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У стужцы выкарыстаны архіўныя кадры Мінска мінулага стагоддзя, партрэт маэстра ствараецца дзякуючы ўспамінам яго сяброў і калег. Суседка Міхаіла Фінберга, якая памятае яго з дзяцінства, распавядае аб кволым хлопчыку, які кожны дзень іграў на губным гармоніку ў двары. Калі іншым дзецям гэта надакучвала, яны з акенцаў кідалі ў маленькага Мішу каменьчыкі... З такіх падрабязнасцяў і складаецца жывы партрэт гістарычнай асобы. Дакументальны фільм «Імправізацыя» быў створаны здымачнай групай тэлеканала «Беларусь 3».

Таксама ў холе кінатэатра была зладжана выстава «Заўсёды з вамі. Міхаіл Фінберг». У экспазіцыю ўвайшлі асабістыя рэчы народнага артыста Беларусі: касцюмы з канцэртаў, фотаздымкі, узнагароды і нават кветкі з мерапрыемстваў, у якіх маэстра прымаў удзел.

## ТРАДЫЦЫІ ФЕСТЫВАЛЮ І ПАЧАТАК НОВАГА АДЛІКУ

Немагчыма ўявіць «Маладзечна-2022» без Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні. Конкурсныя этапы традыцыйна прайшлі ў Палацы культуры.

Адметна, што сярод удзельнікаў былі юныя таленты, што толькі пачынаюць свой творчы шлях, і моладзь, якая ўжо дасягнула пэўных вышынь. Напрыклад, хтосьці ўжо і сам выкладае вакал для маленькіх дзетак. У суправаджэнні аркестра гучалі песні на вершы Максіма Багдановіча, слухачы пазнавалі знакамітыя мелодыі Уладзіміра Мулявіна, а таксама беларускія народныя песні.

Фінальнае мерапрыемства першага дня — урачыстае адкрыццё XXI Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі, цэнтральнай падзеяй якога стала канцэртная праграма «XXI — адлік новага часу. Пачатак» у выкананні Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Максіма Расохі.

**Міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ** адзначыў, што падрыхтоўка да фестывалю была сур'ёзнай:

— Мы ў рабоце над фестывалем захавалі добрыя традыцыі, якія існуюць на працягу 20 гадоў. Я ўпэўнены, што тыя гледачы, якія знаходзяцца ў амфітэатры, госці адчуюць задавальненне ад новых падыходаў, якія мы пастараліся прымяніць менавіта на XXI фестывалі. Думаю, мы не памыліліся, і глядач атрымае задавальненне.

Падчас урачыстага адкрыцця фестывалю адбылося ўзнагароджанне лаўрэатаў конкурсу маладых выканаўцаў. Гран-пры атрымала Ганна Рыбакова. Дзяўчына скончыла Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Аркадзя Куляшова па спецыяльнасці «Музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія». Зараз яна працуе педагогам-арганізатарам у магілёўскай школе.

На працягу фестывальных дзён Маладзечна змянілася, у розных куточках горада можна было адчуць, што зараз адбываецца нацыянальнае свята. Недзе стаіць каляровая лаўка, распісаная імёнамі класікаў беларускай літаратуры, з крамы чуваць «Белавежскую пушчу» ў выкананні «Песняроў»... Але галоўны адбітак беларускай культуры нясуць удзельнікі і госці форуму. Тыя, хто спецыяльна прыехаў у Маладзечна, каб дакрануцца да нашай мовы, паэзіі і музыкі.

**Арына КАРПОВІЧ.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД і БелТА.**

Надвор'е

# ТЫДЗЕНЬ ПАД ЗНАКАМ ДАЖДЖУ І ХАЛОДНЫХ НАЧЭЙ

## У гэты час тэмпературны рэжым будзе каля нормы, а месцамі і на 3-4 градусы ніжэйшы

**Ужо з аўторка ўмовы надвор'я ў Беларусі будзе вызначаць цыклон, які ссоўваецца праз тэрыторыю нашай краіны на Пскоўскую вобласць Расіі. Гэта абумовіць на тэрыторыі Беларусі ветранае, з дажджамі рознай інтэнсіўнасці і навальніцамі надвор'е. Пры развіцці канвектыўнай воблачнасці ўначы ў многіх раёнах, а днём месцамі па краіне пройдуць досыць інтэнсіўныя дажджы, якія будуць суправаджацца навальніцамі. У начныя гадзіны месцамі, а ўдзень у многіх раёнах будзе ўзмацняцца вецер да моцнага парывістага. Пры гэтым у краіну пачне паступаць больш прахалодная паветраная маса, тэмпературны фон панізіцца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Халаднавата будзе ўжо ў аўторак. На большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі моцныя дажджы і навальніцы. Удзень у многіх раёнах узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Максімальная тэмпература паветра днём складзе плюс 14—20 градусаў, а па ўсходзе паветра прагрэецца да 22 цэлпа.

У сераду будзе чарговая змена надвор'я, уладу над якім бярэ Балтыка. З пачатку гэтых сутак следам за цыклонам будзе паступова адступаць і зона ападкаў, таму ўначы па поўначы краіны чакаюцца толькі кароткачасовыя дажджы. Днём з Балтыйскага мора на тэрыторыю краіны перамесціцца атмасферны фронт, і дажджы распаўсюдзяцца на большую частку Беларусі. У дзённыя гадзіны месцамі па краіне дажджы будуць суправаджацца навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы — плюс 5—11 градусаў, а ўдзень — ад плюс 17 градусаў да 23 цэлпа.

У далейшым франтальныя раздзелы пакінуць тэрыторыю Беларусі, і ў няўстойлівай паветранай масе ападкаў будзе няшмат. Днём месцамі прагрымяць навальніцы. У чацвер уначы будзе пераважна без ападкаў, а ўдзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ноччу тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 5 да плюс 10 градусаў, а днём — ад плюс 18 цэлпа да плюс 24 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу ўначы месцамі, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны зноў пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень магчымы навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ноччу будзе плюс 8—14 градусаў, а днём — плюс 18—24 градусы.

Бліжэй да выхадных сонца пачне актыўнічаць, а дажджы адступяць. У суботу будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Нават ноччу паветра прагрэецца да плюс 7—13 градусаў, а ўдзень стане наогул камфортна — 21—26 цэлпа. Так трымаць.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Продавец – ОАО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы». Оператор – «Единая система электронных торгов» torgi.gov.by.**

**Предмет электронных торгов и его месторасположение**

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 620/С-22976 (наименование – цех по переработке мяса, назначение – цех по переработке мяса). Составные части и принадлежности: целое одноэтажное панельное здание цеха по переработке мяса с блочной пристройкой, подъездной дорогой из асфальтового покрытия, ограждения из бетонных плит. Коммуникации отсутствуют, имеется возможность их подведения.
Информация о земельном участке: кадастровый номер 622200000001000041, площадь 0,3483 га (право постоянного пользования).
Начальная стоимость с НДС 20 % – 221 557,26 рубля.
Сумма задатка в размере **5 %** от начальной стоимости.
Условия оплаты: победитель аукциона обязан оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе лота в течение 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи, сумма задатка засчитывается в счет оплаты стоимости лота.
Победитель аукциона возмещает затраты на проведение торгов согласно прейскуранту, размещенному на главной странице torgi.gov.by, в разделе «Информация».

1. Электронные торги состоятся **12.07.2022** на электронной торговой площадке оператора torgi.gov.by.
2. Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Единая система электронных торгов», размещенным на сайте: torgi.gov.by.
3. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, аккредитованное на электронной торговой площадке, подает оператору электронной торговой площадки заявление и документ, подтверждающий внесение суммы задатка.
4. Последний день подачи заявлений **11.07.2022.**
5. Шаг аукциона **5 %** от начальной цены предмета торгов.
6. Победитель торгов (претендент на покупку) в установленном порядке в соответствии с условиями торгов с продавцом заключает договор купли-продажи имущества.
7. Подробную информацию о порядке, условиях проведения электронных торгов, предмете торгов можно получить по тел.: +375 29 618 80 53, +375 29 659 82 72, +375 17 257 01 92, +375 29 674 73 74.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «ГрузАвтоТрак», Минский р-н, Михановичский с/с, административное здание, пом. 2-5 |

**Предмет электронных торгов: транспортное средство с пробегом. Месторасположение: г. Минск ул. Карвата, 61**

**Грузовой специальный фургон изотермический** JAC HFC 1063K TCT 3700JA, р/з АТ 5094-5, № кузова Y393700JAE0121011, инв. № 0000000003

**Начальная цена, без НДС – 14 500,00 бел. руб.** Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор победителю аукциона для подписания. |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | **100 процентов** от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение **10 рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи |

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **10 (десять) %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: начало торгов **11.00 15.07.2022 г.** Окончание торгов **13.00 15.07.2022 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **14.07.2022 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
**по продаже имущества юридического лица, находящегося в процессе ликвидации**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2022.Ч.002.00054** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.
**Продавец:** открытое акционерное общество «Оршанский комбинат строительных материалов», 211038 Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Копысь, ул. Октябрьская 80, тел.: +375 29 2953541, +375 216 576881.
**Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.
**Дата и время проведения повторных торгов 29 июня 2022 г. в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).
**Лот № 1**. Грузовой фургон GAZ-66 1986 г. в., рег. знак АК 0027-2, цвет – зеленый, кузов (рама) 0471459, инв. № 5039.
**Нач. цена**: 1 083,60 бел. руб. с учетом НДС 20 %. Задаток: 108,36 бел. руб.
**Лот № 2**. Экскаватор ЭО-3223 кат. F, 2009 г. в., рег. знак № ВК-2 2950, инв. № 649.
**Нач. цена**: 10 936,80 бел. руб. с учетом НДС 20 %. Задаток: 1 093,68 бел. руб.
**Лот № 3.** Полуприцеп тракторный универсальный ПТУ-7,5 2008 г. в., рег. знак № ВК-2 2931, инв. № 638.
**Нач. цена**: 2 242,80 бел. руб. с учетом НДС 20 %. Задаток: 224,28 бел. руб.
**Лот № 4.** Полуприцеп тракторный универсальный ПТУ-7,5 2008 г. в., рег. знак № ВК-2 3331, инв. № 639.
**Нач. цена**: 2 242,80 бел.руб. с учетом НДС 20 %. Задаток: 224,28 бел руб.
**Лоты №№ 1–4** находятся по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, Ленина, 36.
**Лот № 5.** Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 240/U-128903 площадью 107,7 кв. м (наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, назначение – здание неустановленного назначения) по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Стадионная, 2Б на земельном участке с кад. № 223681102101000219 площадью 0,2127 га по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Стадионная, 2Б (право аренды по 29.11.2068), целевое назначение зем. участка – для обслуживания не завершенного строительством законсервированного капитального строения. Ограничения: зона санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора, охранные зоны электрических сетей напряжением свыше 1000 В. Обременение – ипотека ОАО «Белагропромбанк». **Нач. цена**: 13 500,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %. **Задаток**: 1 350,00 бел. руб.
Повторные электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по электронным торгам: **до 16.00 28.06.2022.** ***Суммы задатков по электронным торгам перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».*** Условия повторных электронных торгов: победитель (претендент на покупку) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам электронных торгов документации, необходимой для их проведения, возместить расходы на проведение независимой оценки, оплатить услуги оператора ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 рабочих дней со дня проведения электронных торгов после возмещения затрат на организацию и проведение электронных торгов, расходов на проведение независимой оценки, услуг оператора ЭТП; оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by. Имущество, бывшее в употреблении. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по месту нахождения имущества по предварительному согласованию с Продавцом: Хоруженок Людмила Альбиновна, +375292953541.

### ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества частного предприятия «КРЕОЛА ПЛЮС» (УНП 790850154), объявляет о проведении **15.07.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме. Адрес нахождения имущества: г. Бобруйск, ул. Ново-Шоссейная, 47А. Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

УНП 193417684

Директор **ООО «Арбитр»** Долгов Р.С.
**сообщает, что собрание кредиторов по защите требований**
**КУП «Волковысское коммунальное хозяйство»**

в сумме 121 015 рублей 69 копеек по делу № 33-3б/2018 о банкротстве в отношении ОАО «Волковысская МПМК-142» (УНП 500029534) состоится 28.06.2022 в 11.00 (по месту расположения должника: г. Волковыск, ул. Зенитчиков, 46 (проходная)).
Ознакомиться с предъявленными требованиями и выдвинутыми возражениями можно по адресу управляющего ООО «Арбитр»: г. Гродно, ул. Суворова, д. 127, корп. 5, каб. 411, тел. (80152) 657599.

УНП 590995276

## ИНФОРМАЦИЯ
о проведении **29 июня 2022 года в 11.00**
повторных аукционных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
## УП «Минское отделение Белорусской железной дороги»

**Сведения о предмете торгов** (наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества): изолированное помещение с инв. номером 500/D-686110, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 2-2Н, общая площадь – 239,3 кв. м (назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – помещение неустановленного назначения) и установленные в нем системы и оборудование: система контроля и управления доступом в международных кассах с инв. номером 0440246, автоматическая установка системы охранного телевидения помещений ж/д касс с инв. номером 0440248, щит ВРУ Щ81 ИНЗ-У 1А касс с инв. номером 0440249, щиток распределительный с блоком АВР Щ81 ИН5-У1А с инв. номером 0440250, теплообменник пластинчатый Р-0,06-1,02-2Х касс с инв. номером 0440253, система видеонаблюдения с инв. номером 0440247, система тепловой автоматики касс с инв. номером 0440252, охранная сигнализация с инв. номером 0440251, концентратор (электрооборудование) ЕА 8086/1 кассы с инв. номером 0440254

| | |
|---|---|
| **Начальная цена** (без учета НДС) – 1 772 080,0 бел. руб. | **Размер задатка** – 177 208,0 бел. руб. |

**Продавец имущества –** УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220030, г. Минск, ул. Свердлова, 28; Минская дистанция гражданских сооружений УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220014, г. Минск, пер. Автодоровский, 11, тел.: (017) 225-22-25, (017) 225-57-89, (017) 225-38-12

**Организатор торгов –** государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел.: +375 (17) 365 48 36

**Срок и место приема заявлений: по 27.06.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6

Порядок оформления участия в торгах и проведения аукциона изложен в извещении о проведении торгов, размещенном на интернет-сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы/Недвижимость в собственность»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

**Телефон для справок** +375 (17) 365 48 36.

### ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества частного предприятия «КРЕОЛА ПЛЮС» (УНП 790850154), объявляет о проведении **27.06.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме. Адрес нахождения имущества: г. Бобруйск, ул. Ново-Шоссейная, 47А. Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

УНП 193417684

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания
- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ (ПОВТОРНЫХ) ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | **ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н. Сайт в интернете: www.iin.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29** |
| **Ранее опубликованное извещение о проведении публичных торгов (аукциона)** | **Извещение о проведении публичных торгов опубликовано 01.06.2022 в газете «Звязда» № 105 (29727), стр. 6.** |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| **1** | **Изолированное помещение** общей площадью 604,6 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145106, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Короля, 2/9-1. Назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – помещение неустановленного назначения | 425 329,92 | 190 476,20 |

**Задаток 3 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30 123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота либо цены за лот, складывающейся в ходе торгов.
В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после публичных торгов (аукциона)

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 2 месяца** со дня заключения договора купли-продажи.

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу:** www.iin.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,7 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона)**
Начало торгов: 11.00 24.06.2022 г.
по адресу г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 23.06.2022 г. до 16.00 по адресу: г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95. E-mail: e.pinchuk@iin.by.** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
**Организатор аукциона – Червенский районный исполнительный комитет**

| № лота | Сведения о виде и предмете аукциона | Адрес объекта и его наименование, срок аренды | Начальная цена объекта (рублей) | Сумма задатка (рублей) | Расходы по организации и проведению аукциона (рублей) | Ограничения (обременения) прав в использовании земель и другие ограничения |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Аукцион на право заключения договора аренды земельного участка | Земельный участок для строительства и обслуживания многофункционального комплекса, расположенного по адресу: Минская обл., Червенский р-н, г. п. Смиловичи, площадь – 0,4455 га, кадастровый номер 625883590601001720, срок аренды – 99 лет | 54 874,46 | 5 487,45 | 4590,91 + расходы по размещению извещения в СМИ | Охранные зоны электрических сетей напряжением свыше 1000 В, площадь – 0,2391га; водоохранная зона реки Волма площадь – 0,4455 га |
| 2 | Аукцион по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь | Земельный участок для ведения коллективного садоводства, площадь – 0,0506 га, кадастровый номер 625880800001001098, расположенного по адресу: Червенский р-н, Валевачский с/с, СТ «ГИГИЕНИСТ-1», участок № 58 | 3 200,00 | 320,00 | 1524,78 + расходы по размещению извещения в СМИ | Охранные зоны электрических сетей, площадь – 0,0025 га |
| 3 | | Земельный участок для ведения коллективного садоводства, площадь – 0,0473 га, кадастровый номер 625880800001001099, расположенного по адресу: Червенский р-н, Валевачский с/с, СТ «ГИГИЕНИСТ-1», участок № 17 | 3 100,00 | 310,0 | 1524,78 + расходы по размещению извещения в СМИ | |

Задаток перечисляется на расчетный счет BY94AKBB3641062700002600 0000 в ЦБУ 627 филиала № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 600008398. Оплата объекта аукциона (включая затраты, связанные с его проведением) должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. Для участия в аукционе представляются: заявление, документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка, а также иные документы, предусмотренные Положениями о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков и продажи земельных участков в частную собственность, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. При подаче заявления заключается соглашение с райисполкомом о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Аукцион состоится **18 июля 2022 года** в 11.00 в здании Червенского райисполкома (зал заседаний) по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1, райисполком, кабинет 69, тел. 80171428491 по 15 июля 2022 года включительно.

Лічбавізацыя

# ІНТЭРАКТЫЎНЫЯ КАРТЫ, «ЗЯЛЁНЫЯ» ТЭХНАЛОГІІ І ВЁСКІ БУДУЧЫНІ



## Мінпрыроды прадставіла праекты на XXVIII Міжнародным форуме ІКТ ТІБА-2022

**Кіраванне воднымі рэсурсамі, фарміраванне цыркулярнай (замкнёнага цыкла) эканомікі, план дзеянняў па развіцці «зялёнай» эканомікі, рэйтынг экалагічнага развіцця рэгіёнаў краіны... Пра гэтыя і іншыя дасягненні і планы міністэрства ішла гаворка падчас II Форуму «Лічбавая эканоміка» ў рамках выставы, а таксама на стэндзе «Разумны горад», дзе былі прадстаўлены здабыткі Мінпрыроды.**

### Электрычныя дамы, чыгунка і транспарт

Высокая хуткасць і распаўсюджанасць працэсаў трансфармацыі ў галінах — залог устойлівага развіцця краіны, канкурэнтаздольнасці эканомікі і росту дабрабыту насельніцтва. «Зялёная» эканоміка і яе галоўны інструмент — «зялёныя» тэхналогіі — асноўны кірунак развіцця сацыяльна-эканамічнай сферы Беларусі сёння і ў будучыні, упэўнены **Аляксандр ГАРОШКА, намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— Наша будучыня ў многім залежыць ад таго, наколькі ўдасца забяспечыць рост эканомікі пры захаванні экалагічнага балансу, камфортнага асяроддзя для жыцця людзей. Гэта агульная задача, вырашыць якую можна толькі агульнымі намаганнямі. Пільнай увагі патрабуюць пытанні эканомікі замкнёнага цыкла. Гэта практычны падыход да развіцця «зялёнай» эканомікі, якая арыентавана на замкнёны матэрыяльны цыкл рэсурснага забеспячэння, зніжэнне ўжывання ўсіх відаў сыравінных і паліўна-энергетычных рэсурсаў і максімальнае выкарыстанне адходаў як інструмент забеспячэння ўстойлівага развіцця і экалагічнай бяспекі Беларусі.

Летась урадам краіны была зацверджана пастанова «Аб Нацыянальным плане дзеянняў па развіцці «зялёнай» эканомікі ў Рэспубліцы Беларусь на 2021—2025 гады». Прыярытэтныя кірункі развіцця «зялёнай» эканомікі наступныя:

Устойлівае спажыванне і вытворчасць.

Цыркулярная эканоміка.

Выраб арганічнай прадукцыі.

Развіццё экалагічнага і аграэкатурызму.

Разумныя і энергаэфектыўныя гарады.

Развіццё электратранспарту і гарадской мабільнасці.

Змякчэнне наступстваў змянення клімату і адаптацыя да кліматычных змен.

Захаванне і ўстойлівае выкарыстанне біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці.

«Зялёнае» фінансаванне.

Навуковыя даследаванні, адукацыя, падрыхтоўка кадраў і сацыяльная ўцягнутасць.

— У рамках устойлівага ўжывання і вытворчасці новай рэдакцыяй Закона «Аб ахове навакольнага асяроддзя» прадугледжаны, напрыклад, від экалагічнай сертыфікацыі «парніковыя газы», што суадносіцца з артыкулам 6 Парыжскага пагаднення да Рамачнай канвенцыі ААН аб змяненні клімату, — заўважыла **Таццяна КАНАНЧУК, начальнік галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Мінпрыроды.** — Распрацаваны таксама дзяржаўны стандарт СТБ ISO 14021-2021 «Этыкеткі і дэкларацыі экалагічныя. Самадэкларуемыя экалагічныя заявы (экалагічная маркіроўка тыпу II). Што датычыцца электратранспарту, то ў краіне ўжо электрыфікавана звыш як 27 % гарадскіх пасажырскіх транспартных сродкаў і чвэрць участкаў беларускай чыгункі.

Распрацаваны альбом тыпавых праектаў «Вёска будучыні» — населеныя пункты з поўным наборам выгод для камфортнага жыцця беларуса будуць створаны ў кожнай вобласці. У краіне ўведзена ў эксплуатацыю ўжо амаль 285 тысяч м² электрадамоў.

### Маніторынг вады і смецця анлайн

Важны крок развіцця цыркулярнай эканомікі — лічбавыя тэхналогіі. У гэтым кірунку рэалізуецца маштабны праект рэгіянальнага развіцця «Разумныя гарады Беларусі», які скіраваны на сістэмнае ўкараненне ў рэгіёнах тэхналогій разумных гарадоў і лічбавых тэхналогій. Паспяховая практыка выкарыстання лічбавых тэхналогій ужо існуе ў Полацкім раёне, а таксама ствараецца ў рэспубліканскай інфармацыйнай сістэме аўтаматызаванага маніторынгу навакольнага асяроддзя, абазначыў Аляксандр Гарошка, расказваючы пра іншыя праграмныя прадукты ведамства.

Інфармацыйную сістэму з разлікам рэйтынгу экалагічнага развіцця рэгіёнаў з магчымасцю ўключэння (змянення) даных, іх ацэнкі, ранжыравання, графічнага прадстаўлення па розных паказчыках прадставілі спецыялісты Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў. Гэты прадукт адлюстроўвае комплексную ацэнку экалагічнага стану рэгіёнаў Беларусі на ўзроўні адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак і буйных гарадоў па групах паказчыкаў для рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі краіны ў галіне ўстойлівага развіцця і павышэння якасці навакольля, а таксама павелічэння эфектыўнасці прымянення асобных экалагічных інструментаў у рамках міжнароднага супрацоўніцтва.

Інфармацыйная сістэма дзяржаўнага воднага кадастру ў раздзеле «Рэестр паверхневых водных аб'ектаў Рэспублікі Беларусь» напоўнена прасторавымі (картаграфічнымі) і атрыбутыўнымі (тэматычнымі) звесткамі аб водных аб'ектах: рэках, ручаях, азёрах, вадасховішчах, сажалках, крыніцах, раславялі спецыялісты Мінпрыроды. Гэтая інфармацыя штогод актуалізуецца пасля інвентарызацыі водных аб'ектаў.

Рэспубліканскі цэнтр аналітычнага кантролю ў галіне навакольнага асяроддзя прадставіў на форуме інтэрактыўную карту, якая дазваляе выбраць слаі па кірунку назіранняў лакальнага маніторынгу («выкіды», «сцёкавыя і паверхневыя воды», «падземныя воды», «глебы (грунты)». На карце адлюстроўваецца колькасць крыніц, якія ўключаны ў лакальны маніторынг, і ўзровень уздзеяння на наваколле, а таксама даныя аб лабараторыях, якія рабілі замеры параметраў. А на інтэрактыўнай карце «Схема абарачэння камунальных адходаў г. Мінска», створанай на прадпрыемстве «БелНДЦ «Экалогія», у рэжыме рэальнага часу можна ўбачыць сітуацыю са сталічнымі адходамі.

**Ірына СІДАРОК.**

Актуальнае пытанне

# ПРЫРОДА НЕ ЦЕРПІЦЬ ЗАСЛОНЫ!

## Што робіць Мінпрыроды для спынення ўзвядзення Польшчай загараджальнага збудавання ўздоўж беларуска-польскай граніцы

**Жалезная агароджа, якую пачалі будаваць у студзені гэтага года, раздзеліць на часткі каштоўныя трансгранічныя прыродныя тэрыторыі, у тым ліку аб'ект Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА «Белавежская пушча» і біясферны рэзерват «Прыбужскае Палессе». Гэта можа вельмі негатыўна адбіцца на стане экасістэм і мясцовых папуляцый жывёл і раслін. Таму Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя робіць усё магчымае, каб спыніць згубнае будаўніцтва. У гэтым пытанні яно імкнецца прыцягнуць увагу і атрымаць падтрымку кампетэнтных міжнародных арганізацый і органаў шматбаковых прыродаахоўных пагадненняў. Пра тое, што ўжо атрымалася зрабіць, расказала намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Мінпрыроды Ларыса ЛУКІНА.**





### Хроніка зваротаў

28 лютага 2022 года Мінпрыроды накіравала ў Сакратарыят Канвенцыі аб ахове дзікай фаўны і флоры і прыродных асяроддзяў у Еўропе (Бернскай канвенцыі) зварот на адкрыццё краінавага кейса ў адносінах да Польшчы.

1 сакавіка ў адрас Генеральнага дырэктара Савета Еўропы па пытаннях дэмакратыі Сняжаны Самарджыч-Марковіч накіравана пісьмо міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя Худыка з выказваннем занепакоенасці, звязанай з сітуацыяй на мяжы Беларусі і Польшчы, і просьбай разгледзець пытанні правядзення аператыўнага маніторынгу гэтай сітуацыі, прыняць адпаведныя меры і даць прававую ацэнку дзеянням Польшчы ў частцы выканання патрабаванняў Бернскай канвенцыі.

Пісьмо Мінпрыроды было накіравана 4 сакавіка і ў Цэнтр Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА з просьбай звярнуць увагу польскага боку на неабходнасць выканання ўзятых міжнародных абавязацельстваў і заклікаць Польшчу спыніць узвядзенне агароджы.

9 сакавіка ў адрас міністра клімату і навакольнага асяроддзя Польшчы Ганны Масквы кіраўнік прыродаахоўнага ведамства Беларусі накіраваў пісьмо. Акрамя выказвання занепакоенасці будаўніцтвам сцяны, ён папрасіў даць інфармацыю аб ацэнцы ўздзеяння гэтага працэсу на біялагічную разнастайнасць Белавежскай пушчы, а таксама аб мерапрыемствах, накіраваных на мінімізацыю негатыўных наступстваў на гэты трансгранічны прыродны комплекс. Адказу на пісьмо не паступала.

29 сакавіка ўдзельнікі пасяджэння грамадскага каардынацыйнага экалагічнага савета (ГКЭС) пад кіраўніцтвам міністра вырашылі распачаць інфармацыйную кампанію па ўцягванні шырокага кола грамадскасці ў абмеркаванне пытання недапушчэння будаўніцтва штучных загарод у трансгранічных заходніх зонах. Было накіравана 40 зваротаў у грамадскія арганізацыі за мяжой, прайшлі сустрэчы са студэнтамі, пікеты каля пасольстваў, інфармацыя аб праблеме распаўсюджвалася і праз сацыяльныя сеткі.

Брэсцкае абласное аддзяленне Беларускага геаграфічнага таварыства, кіраўнік якога Ірына Абрамава — член абласнога ГКЭС, ад імя жыхароў Брэсцкай вобласці накіравала ў ЮНЕСКА і Савет Еўропы петыцыю супраць будаўніцтва загароды. Яе падпісалі 115 тысяч чалавек.

6 красавіка Мінпрыроды звярнулася ў адрас Міжнароднага саюза аховы прыроды і прыродных рэсурсаў з просьбай звярнуць увагу сусветнай супольнасці і органаў дзяржкіравання, у першую чаргу польскіх, на парушэнне міжнародных дагавораў. Яны прадугледжваюць абавязак дзяржаў-падпісантаў ажыццяўляць дзейнасць у рамках сваёй юрысдыкцыі ці кантролю на аснове шырокага прымянення прынцыпу прыняцця мер засцярогі, не наносячы шкоды навакольнаму асяроддзю іншых дзяржаў ці раёнаў за межамі дзеянняў нацыянальнай юрысдыкцыі.

### Справа зрушылася

26—29 красавіка Мінпрыроды выступіла на падрыхтоўчым пасяджэнні еўрапейскага рэгіёна да 14-й Канферэнцыі Бакоў Канвенцыі аб водна-балотных угоддзях, што маюць міжнароднае значэнне галоўным чынам у якасці месцапражыванняў вадаплаўных птушак (Рамсарскай канвенцыі). Прадстаўнікі ведамства звярнулі ўвагу на небяспеку парушэння гідралагічнага рэжыму балота Дзікое — часткі Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА «Белавежская пушча» і рамсарскай тэрыторыі — у сувязі з будаўніцтвам загараджальнага збудавання для адкрыцця адпаведнай справы, згодна з палажэннямі канвенцыі.

17 мая ў адрас міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь паступіла пісьмо намесніка генеральнага дырэктара ЮНЕСКА па пытаннях культуры Эрнеста Атонэ Рамірэса. Ён адказаў, што пытанне стану захаванасці гэтага аб'екта Камітэт Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА разгледзіць на сваёй 45-й сесіі.

Акрамя таго, адказам на шматлікія звароты беларускага боку да кампетэнтных міжнародных арганізацый стала накіраванне дырэктарам Цэнтра Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА Лазарам Элунду Асома пісьма на адрас дзяржаўнага сакратара Міністэрства клімату і навакольнага асяроддзя Рэспублікі Польшча Малгажаты Галіньскай з настойлівай просьбай прыпыніць работы па будаўніцтве загароды, калі яны былі ўжо распачаты, прадставіць дакумент з ацэнкай патэнцыйнага ўздзеяння праекта на выдатную ўнікальную каштоўнасць аб'екта і яго цэласнасць, а таксама падрабязныя звесткі пра збудаванне, уключаючы наглядную інфармацыю.

Падчас пленарнага пасяджэння міжнароднай сустрэчы «Стакгольм+50: Здаровая планета для ўсеагульнага росквіту — наша адказнасць, наша магчымасць» (2—3 чэрвеня 2022 года) Андрэй Худык таксама выступіў з відэазваротам, у якім кіраўнік прыродаахоўнага ведамства заклікаў Польшчу спыніць узвядзенне агароджы і звярнуўся ў адрас міжнароднай супольнасці з прапановай падтрымаць гэты заклік.

— Мінпрыроды будзе працягваць гэту работу, — падкрэсліла Ларыса Лукіна. — Мы таксама заклікаем усіх неабыякавых падтрымаць яго ініцыятыву, каб разам змагацца за захаванне цэласнасці і дабрабыту найкаштоўнейшых прыродных тэрыторый.

**Інга ЗУБРЫЦКАЯ.**

У свеце раслін

# НЕ СУМУЙЦЕ ПА СУМНІКУ!

## Як у краіне вядуць барацьбу з інвазійнымі відамі?

**Сумнік канадскі і баршчэўнік Сасноўскага некалькі гадоў таму сталі аб'ектамі пільнай увагі спецыялістаў у галіне аховы навакольнага асяроддзя і здароўя. Калі першая расліна моцна шкодзіць мясцовым экасістэмам, то другая яшчэ і нясе сур'ёзную небяспеку для жывых арганізмаў, у тым ліку чалавека. Як у нашай краіне наладжана работа па выяўленні і знішчэнні гэтых агрэсараў?**



### Небяспечны «парасон»

Гэту расліну сямейства парасонiстых можна заўважыць здалёк. У вышыню баршчэўнік Сасноўскага вырастае да 3-4 метраў, а яго карані захопліваюць каля метра глебы ў глыбіню. Разам з высокай прадукцыйнасцю насення гэта робіць яго вялікім ворагам для мясцовай флоры і фауны, а таксама чалавека.

Распаўсюджванне баршчэўніку прыводзіць да частковай ці поўнай дэфармацыі натуральных фітацэнозаў. Ён здольны пранікаць і пад полаг лесу, дзе выцясняе расліны ніжніх ярусаў. Высокія сцёблы і велізарныя лісты дазваляюць захапіць ім найлепшыя месцы ў барацьбе за сонечнае святло. Там, дзе растуць прадстаўнікі віду, каля 80 % святла паглынаецца імі. У выніку парушаецца біялагічная раўнавага ў аграбіяцэнозах, рэзка памяншаецца колькасць іншых відаў раслін.

**Асноўная небяспека пры судакрананні з баршчэўнікам Сасноўскага — апёкі на скурных покрывах, якія выклікаюцца часткамі расліны, яе сокам і пылком.**

Акрамя таго, сок баршчэўніку Сасноўскага ўтрымлівае фуракумарыны — рэчывы, якія імкліва павышаюць адчувальнасць арганізма да ўльтрафіялетавага выпраменьвання. Калі сок трапіць на скуру чалавека, то пад уплывам сонечных прамянёў павялічваецца яе пігментацыя. Гэта выклікае дэрматыты, якія працякаюць па тыпу апёкаў. Але адразу пасля кантакту ніякіх змен на скуры не заўважана. Апёкі ўзнікаюць на другі-трэці дзень. Гэта можа прывесці як да проста пачырвання і ацёчнасці скуры, так і да павышэння тэмпературы цела, галаўнога болю, пухіроў з серозным змесцівам.

### Прыгажун-агрэсар

Сумнік канадскі — таксама даволі высокая расліна. У сваім росквіце ён можа дасягаць 160—200 см у вышыню. Ён вельмі агрэсіўна сябе паводзіць у прыродзе. Усяго ад адной яго расліны можа ўтварыцца каля 20 000 семянак, усходжасць якіх часам дасягае 95 %. Насенне лёгка разносіцца ветрам, размнажаецца і вегетатыўна. Трапляючы на пусткі і іншыя землі, якія не выкарыстоўваюцца ў гаспадарцы, інвазійны від пачынае займаць усё большыя тэрыторыі. Гэта прыводзіць да змянення натуральнай флоры, прыгнячэння росту абарыгенаў. Пасля таго, як сумнік канадскі захапіў адкрытыя ўчасткі, ён паступова рухаецца і пад полаг лесу. Негатыўна ўплываючы на расліны, агрэсар шкодзіць і мясцовым жывёлам, якія насяляюць гэтыя экасістэмы.

### Закон супраць інвазій

Менавіта дзейнасць чалавека, а часам і яго бяздзейнасць прывялі да такіх цяжкіх наступстваў. Каб зберагчы прыроду і здароўе грамадзян, а таксама прадухіліць шкоду для асобных галін эканомікі, у нашай краіне распрацавалі шэраг нарматыўна-прававых актаў. Напрыклад, у Законе «Аб раслінным свеце» прапісана, што для гэтага неабходна праводзіць спецыяльныя мерапрыемствы, якія рэгулююць распаўсюджванне і колькасць баршчэўніку Сасноўскага і сумніку канадскага, а таксама іншых раслін-агрэсараў. Віды, што нясуць сур'ёзную шкоду навакольнаму асяроддзю, пералічаны ў спісе, устаноўленым пастановай Савета Міністраў «Аб некаторых пытаннях рэгулявання распаўсюджвання і колькасці відаў раслін».

### Ад касы да хімікатаў

Паколькі баршчэўнік Сасноўскага размнажаецца толькі насеннем і не дае каранёвых парасткаў, спецыялісты раяць пачынаць барацьбу з ім задоўга да цвіцення. Для гэтага выкарыстоўваюць розныя спосабы: ад ручнога да камбінаванага — у залежнасці ад займанай плошчы, шчыльнасці папуляцыі, ступені пагрозы для людзей і наваколля і іншых фактараў.



Калі баршчэўнік толькі з'явіўся на тэрыторыі і яго яшчэ невялікая колькасць (да 200 асобін), можна перасячы яго карані рыдлёўкай і выдаліць расліны.

Механічны спосаб заключаецца ў шматразовым выкошванні парасткаў баршчэўніку (не менш за 3—5 разоў за вегетацыйны сезон) праз 3-4 тыдні.

Пры хімічным спосабе выкарыстоўваюцца спецыяльныя рэчывы — гербіцыды, якія выклікаюць гібель раслін. Спецыялісты лічаць эфектыўнымі тыя сродкі, у якіх дзеючым рэчывам з'яўляецца гліфасат. З яго дапамогай знішчаецца не толькі надземная частка расліны, але і каранёвая сістэма.

Камбінаваны спосаб заснаваны на спалучэнні некалькіх дзеянняў: гэта скошванне, двухразовая апрацоўка гербіцыдамі з інтэрвалам у 3-4 тыдні, ранневеснавое апырскванне па парастках гербіцыдамі суцэльнага дзеяння, а праз два тыдні — узворванне.

Пры барацьбе з сумнікам канадскім таксама прымяняюцца розныя меры. Калі расліна яшчэ не паспела шырока распаўсюдзіцца, падыдзе механічны спосаб — касіць трэба некалькі разоў на працягу ўсяго сезона, у тым ліку нават невялікія парасткі (да 15—20 см). Можна таксама дадаткова ўзворваць зямлю. А ў месцах масавага распаўсюджвання лепш выкарыстоўваць хімічны ці камбінаваны спосаб. На асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях, дзе гербіцыды ўжываць нельга, займаюцца праполкай, глыбокім узворваннем, прымяняюць пакрыўныя матэрыялы і іншае.

Галоўная парада ад навукоўцаў — зямля не павінна пуставаць. У выпадку з сумнікам лепш правесці залужэнне тэрыторыі мясцовымі травамі.

### Адказнасць — на кожным землекарыстальніку

Калі сумнік ці баршчэўнік з'явіўся на вашым участку, вы як землекарыстальнік павінны знішчаць гэтыя расліны. Гэта патрабаванне прапісана ў Законе «Аб раслінным свеце». Так, карыстальнікі зямельных участкаў ці водных аб'ектаў (як юрыдычныя асобы, так і грамадзяне) абавязаны ажыццяўляць у выпадках і парадку, устаноўленых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, работы па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці інвазійных раслін. Калі яны не выконваюць гэту працу, то тым самым парушаюць прыродаахоўнае заканадаўства і павінны несці адказнасць.

Інфармацыю пра тое, якія менавіта і наколькі моцна «забруджаныя» землі, збіраюць тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды і мясцовыя органы ўлады. На яе аснове складаюцца планы па навядзенні парадку на зямлі (рэспубліканскі і абласныя), а таксама раённыя планы мерапрыемстваў па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці інвазійных відаў раслін. У іх і прапісваюцца канкрэтныя заданні па барацьбе з баршчэўнікам Сасноўскага і сумнікам канадскім.

Як расказала **галоўны спецыяліст аддзела кантролю за аховай і выкарыстаннем зямель, нетраў, біяразнастайнасці, асабліва ахоўных прыродных тэрыторый Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Кацярына ГРАМЫКА,** на аснове вышэйзгаданых планаў тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды да пачатку мерапрыемстваў накіроўваюць землекарыстальнікам патрабаванні, якія ўтрымліваюць пералік месцаў і плошчы росту гэтых раслін, а таксама спосабы барацьбы, уключаючы тэхналогію і тэрміны іх правядзення.



Наколькі адказна грамадзяне ці юрыдычныя асобы падышлі да выканання гэтых заданняў, інспектары і спецыялісты аховы прыроды правяраюць падчас кантрольных мерапрыемстваў. Калі яны не выкананы, выкананы неналежна ці несвоечасова, карыстальнікі зямельных участкаў прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці па артыкуле 24.1 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Згодна з ім, можна атрымаць як папярэджанне, так і штраф у памеры да 20 базавых велічынь.

### Сталічны рэгіён самы складаны

Мінская вобласць — адзін з рэгіёнаў краіны, дзе абодва віды раслін паводзяць сябе досыць агрэсіўна. Так, па плошчы, якую займае баршчэўнік Сасноўскага, яна доўгі час трымае другое месца ў краіне. Даволі шмат у цэнтральнай часці і папуляцый сумніку канадскага.

Паводле слоў Кацярыны Грамыкі, на пачатак 2022 года па выніках палявых абследаванняў і навуковых даследаванняў на тэрыторыі вобласці ўстаноўлена 329 карыстальнікаў зямельных участкаў і водных аб'ектаў, у якіх выяўлена 1323 месцы, дзе расце баршчэўнік Сасноўскага. Ён займае плошчу 668,47 га. Больш за ўсё яго можна сустрэць на сельскагаспадарчых тэрыторыях і аб'ектах (374,93 га) і землях агульнага карыстання населеных пунктаў (179,2 га). Менш за ўсё расліна сустракаецца на тэрыторыях садаводчых таварыстваў (0,07 га).

Мерапрыемствы па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага звычайна праходзяць на ўсёй плошчы, якую займае інвазійная расліна. Пры гэтым у барацьбе з ёй спецыялісты аддаюць перавагу хімічнаму метаду (гербіцыдамі апрацоўваецца каля 90 % тэрыторыі).

На жаль, па-ранейшаму выяўляюцца і новыя месцы, якія захоплівае баршчэўнік. У мінулым годзе ў Мінскай вобласці падчас інвентарызацыі знойдзена 158 такіх месцаў на плошчы 32,712 га. Усе яны былі апрацаваныя.

**Баршчэўнік валодае высокай экалагічнай пластычнасцю, добрай холадаўстойлівасцю і марозаўстойлівасцю (здольны пераносіць вясновыя і восеньскія замаразкі да -7 ⁰С, пад глыбокім снегам да -35 — -45 ⁰С).**

Да найбольш інвазіраваных адносяцца Лагойскі, Мінскі, Вілейскі і Валожынскі раёны. На іх долю прыходзіцца 80 % (539,499 га) ад агульнай плошчы росту баршчэўніку ў цэнтральным рэгіёне краіны.

***

Сумнік канадскі займае ў Мінскай вобласці яшчэ больш тэрыторыі, чым баршчэўнік. 379 землекарыстальнікаў вымушаны змагацца з інвазіяй, якая захапіла паводле даных на пачатак 2022 года 2252,95 га (1908 месцаў). У тройцы «сумных» лідараў — Мінскі, Смалявіцкі і Пухавіцкі раёны.

Як і ў выпадку з баршчэўнікам, больш за ўсё сумніку можна сустрэць на землях агульнага карыстання населеных пунктаў (1058,427 га) і сельскагаспадарчых тэрыторыях і аб'ектах (690,676 га). Расце і захопленая ім плошча ў лясным фондзе (233,757 га).

У мінулым годзе спецыялісты выявілі 18 новых месцаў, дзе сустракаецца інвазійны від, на плошчы 1565,4 га. Гэтыя тэрыторыі таксама былі апрацаваныя.

***

Каб знішчыць шкоднікаў сярод раслін, тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды сістэмна працуюць ва ўзаемадзеянні з мясцовымі органамі ўлады, землекарыстальнікамі, на землях якіх выяўлены месцы росту баршчэўніку і сумніку, а таксама са спецыяльнымі абласнымі службамі. Толькі з удзелам усіх зацікаўленых можна вырашыць праблему інвазіі.

**Анастасія АЛЯКСЕЕВА,**
**фота аўтара**
**і з архіва камітэта.**

**Асноўная мера прафілактыкі фітахімічных апёкаў баршчэўнікам — поўнае выключэнне кантактаў скурных покрываў з раслінай. Калі ж яго пазбегнуць не атрымалася, прамыйце апечаны ўчастак вялікай колькасцю халаднаватай вады; змажце апечаную паверхню супрацьзапаленчым крэмам (пантэнол, алазоль і іншыя); не чапайце пухіры, што ўтварыліся; налажыце стэрыльную павязку на ўчастак з вялікімі пашкоджаннямі скуры; пры неабходнасці звяртайцеся ў бальніцу.**

Свет вакол нас

# Знайсці памылку раней, чым яе зробяць

## Дэтэктыўныя складнікі дзяржаўнай экалагічнай экспертызы



**Любое ўздзеянне чалавека на наваколле павінна быць мінімальным і не наносіць шкоду — такім пастулатам кіруецца сучасны свет. А ацэньваюць узровень негатыўнага ўплыву на прыроду ад дзейнасці прадпрыемстваў, транспарту ды іншых створаных намі рэчаў, а таксама экалагічны стан наваколля ў розных дзяржавах спецыяльныя службы. У Беларусі гэта ў тым ліку спецыялісты дзяржаўнай экалагічнай экспертызы — падпарадкаванай арганізацыі Мінпрыроды, задача якіх — на самым раннім этапе (падчас работы з праектнай дакументацыяй) прадухіліць і выключыць магчымае негатыўнае ўздзеянне на прыроду разнастайных аб'ектаў падчас іх дзейнасці. Як праект зроблены, так ён далей і будзе працаваць у якасці прадпрыемства, таму так важна, каб дакумент не меў хібаў, запэўніў Васіль КАВАЛЕНКА, начальнік аддзела дзяржаўнай экалагічнай экспертызы ўпраўлення рэгулявання ўздзеянняў на атмасфернае паветра, змяненне клімату і экспертызы Мінпрыроды, які расказаў, што можа пайсці не так, калі памылку не знайсці да таго, як яе зробяць.**

### Хімік, аграном, следчы...

Дзяржаўную экалагічную экспертызу праходзяць праекты прамысловых аб'ектаў, водаахоўных тэрыторый, праекты лесаўпарадкавання, схемы землеўпарадкавання, горадабудаўнічыя праекты. І гэта яшчэ не поўны пералік, таму эксперты павінны разбірацца ў шматлікіх галінах — яны і эколагі, і хімікі, і матэматыкі, і аграномы, і тэхнолагі...

— Спецыялістам трэба высветліць, ці не з'яўляецца тэрыторыя будучага прадпрыемства асабліва ахоўнай або ці будзе аб'ект размяшчацца на месцы, якое падлягае спецыяльнай ахове (водаахоўная зона або зона санітарнай аховы крыніц водазабеспячэння і водаправодаў пітнога прызначэння), і ацаніць, ці адпавядае праектнае рашэнне прыродаахоўнаму заканадаўству. Эксперт павінен разумець, што паступае на аб'ект і якія рэчывы будуць стварацца падчас пэўных тэхналагічных працэсаў на заводзе, — расказаў Васіль Каваленка.

Эксперты ведаюць усе найлепшыя тэхналагічныя метады для ачысткі сцёкаў і выкідаў ад прадпрыемства. Яны могуць уявіць і разабрацца па чарцяжах і прадстаўленых лічбах, якія працэсы будуць адбывацца на аб'екце і якія ён будзе мець адходы, выкіды ў атмасфернае паветра, скіды сцёкавых вод. Нават пралічыць, у якой прыкладна канцэнтрацыі будуць з'яўляцца гэтыя выкіды і скіды. Спецыялісты арыентуюцца ў інжынерных пытаннях і могуць нават праекціроўшчыкам праекта, які яны бяруць на экспертызу, падказаць, што лепш зрабіць з улікам ухілу мясцовасці ці, скажам, размяшчэння аб'екта адносна вады.



Від зверху на ачышчальныя збудаванні Светлагорскага завода сульфатнай беленай цэлюлозы.

— Водны кодэкс, напрыклад, не забараняе аб'ектам знаходзіцца ў водаахоўнай зоне (акрамя пэўнага пераліку). Аднак эксперт падчас работы кіруецца яшчэ і законамі аб раслінным, жывёльным свеце, ахове атмасфернага паветра. Калі ёсць станоўчыя заключэнні экспертыз усіх датычных ведамстваў, аб'ект будуецца. Аднак калі потым заказчык будзе эксплуатаваць яго не па праекце або зробіць нейкія самастойныя дадатковыя збудаванні ці стане рабіць нешта не па тэхналогіі, то тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды, якія сочаць за эксплуатацыяй, запатрабуюць устаранення парушэнняў, — удакладніў Васіль Каваленка.

Айчыннае заканадаўства ў галіне экалагічнай экспертызы заснавана ў тым ліку і на міжнародных канвенцыях і дагаворах. Прынамсі, у рамках Канвенцыі аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў трансгранічным кантэксце (Эспа) аддзел займаецца рэгуляваннем адносін з міжнароднымі арганізацыямі і з міністэрствамі іншых дзяржаў па пытаннях размяшчэння патэнцыйна небяспечных аб'ектаў на тэрыторыі нашай і іншых краін, падкрэсліў спецыяліст.

### Лішняя труба і «свінцовае пытанне»

Наш суразмоўца на працягу ўсёй сваёй працы ў Мінпрыроды займаецца менавіта экспертызамі прамысловых аб'ектаў на стадыі праектавання і мае вялікі вопыт не толькі ў карпатлівай метадалагічнай рабоце, але і ў вывучэнні ўжо існуючых аб'ектаў.

— У нашай дзейнасці таксама ёсць элементы даследавання і нават пэўнай дэтэктыўнай работы, — упэўнены спецыяліст. — Эксперт — як следчы: ён павінен супаставіць факты, што знаходзяцца ў праектнай дакументацыі ў розных раздзелах. Напрыклад, у раздзеле «Водазабеспячэнне і каналізацыі» будуць адны лічбы, а ў раздзеле «Ахова навакольнага асяроддзя» — іншыя. Глядзіш, а гэта ў выніку не проста арыфметычная памылка, а, аказваецца, праектам мяркуецца дадатковы скід сцёкавых вод, які не пазначаны на карце-схеме, — кажа ён.



Будаўнічая пляцоўка Віцебскай ГЭС.

Напрыклад, на Светлагорскім заводзе сульфатнай беленай цэлюлозы ўсе газы, якія кепска пахнуць, павінны былі спальвацца ў катле. Аднак, калі прадпрыемства запрацавала, жыхары пачаліся скардзіцца на смурод. Спецыялісты выехалі на аб'ект, дзе знайшлі трубу, якой у праекце не значылася. Высветлілася, што насамрэч пры няпоўнай загрузцы катла не ўвесь аб'ём газу спальваецца. Прыйшлося спыніць вытворчасць і прадугледзець дадатковыя прыродаахоўныя мерапрыемствы, у тым ліку ачыстку газаў у скруберах.

Пры будаўніцтве акумулятарнага завода ў Брэсцкім раёне таксама ўзніклі пэўныя праблемы. Людзям было не па сабе, што побач з імі такое патэнцыйна небяспечнае прадпрыемства, таму яны намагаліся неяк вырашыць «свінцовае пытанне». За два гады жыхары напісалі каля 500 лістоў, падзяліўся Васіль Каваленка:

— Улічваючы павышаную ўвагу да гэтага аб'екта, эксперты правялі вялікую работу. Імі рупліва вывучалася прадстаўленая праектная дакументацыя, правяраліся разлікі. Спецыялісты наведалі аналагічныя існуючыя заводы ў Расіі (г. Елабуга) і Узбекістане (г. Джызак), каб суаднесці фактычныя выкіды гэтых прадпрыемстваў з меркаванымі выкідамі завода, які праектуецца ў Брэсцкім раёне. Толькі пасля дэталёвай прапрацоўкі пытання было выдадзена станоўчае заключэнне дзяржаўнай экалагічнай экспертызы па праектнай дакументацыі. А затым, пасля станоўчых лабараторных вымярэнняў, выдадзена таксама і заключэнне аб адпаведнасці аб'екта, які прымаецца ў эксплуатацыю, экалагічнай бяспецы.

Вынікі работы дазваляюць канстатаваць, што дзейнасць акумулятарнага завода пасля ўводу яго ў эксплуатацыю адпавядае ўсім патрабаванням прыродаахоўнага заканадаўства Беларусі і нарматывам Еўрапейскага саюза. Па выніках вымярэнняў, якія правялі акрэдытаваныя лабараторыі, звышнарматыўных выкідаў у атмасфернае паветра, якія ўказаны ў дазволе на выкіды (праектныя значэнні), ні па свінцы, ні па сернай кіслаце не зафіксавана, удакладніў ён.

Падобных прыкладаў у спецыялістаў мноства, і ў самых розных галінах. Аднак калі з самага пачатку вытрымліваць абазначаныя ў экалагічных нормах і іншых дакументах правілы, то многіх праблем можна ў наступным пазбегнуць.

За год эксперты, якіх на ўсю краіну толькі 50 чалавек, праводзяць больш як дзве тысячы экспертыз. А заключэнняў аб прыёмцы аб'екта ў эксплуатацыю (нават калі экспертыза на ім непатрэбная і не праводзілася) эксперты толькі за першы квартал сёлета выдалі ўжо 1417. А каб выдаць такі дакумент, штораз трэба выязджаць непасрэдна на аб'ект.

**Ірына СІДАРОК.**

Экалогія і закон

### АДПАЧЫВАЙЦЕ БЕЗ ШКОДЫ ДЛЯ ПРЫРОДЫ!



**Каб пасля вашага візіту рака ці лес не заплакалі горкімі слязьмі, выконвайце некалькі простых, але важных правіл, распрацаваных спецыялістамі Мінпрыроды.**

- Адпачывайце ў спецыяльна абсталяваных зонах і месцах.
- Пры адпачынку на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях (у нацыянальным парку, заказніку, запаведніку) выконвайце іх рэжым аховы і выкарыстання. *Штраф за яго парушэнне можа скласці да 500 базавых велічынь.*
- Паркуйце машыну ў спецыяльна прадугледжаным для гэтага месцы ці не бліжэй за 30 м ад берагавой лініі.



Нельга мыць машыны ў межах водаахоўных зон. *Штраф да 50 базавых велічынь.*

- Не пашкоджвайце жывое наглебавае покрыва, напрыклад, пратэктарамі шын. *Штраф да 20 базавых велічынь.*
- Не раскладайце агонь у забароненых месцах. Раскладайце вогнішча па правілах, а лепш выкарыстоўвайце мангал. *За невыкананне гэтых патрабаванняў прадугледжаны штраф да 30 базавых велічынь.*
- Не сячыце і не знішчайце расліннасць. Прывозьце дровы і вугаль з сабой. *У адваротным выпадку вас можа чакаць штраф да 300 базавых велічынь.*
- Не прычыняйце шкоды жывёлам і раслінам і не забірайце жывёл з сабой. *Штраф за парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства — да 500 базавых велічынь.*





- Не чапайце мурашнікі, гнёзды, норы і іншае жыллё дзікіх жывёл. *Штраф за гэтыя дзеянні — да 500 базавых велічынь.*
- Прыбірайце за сабой смецце. *Штраф за парушэнне — да 1000 базавых велічынь.*

Экаадукацыя

# ЭКАЛАГІЧНАЯ АСВЕТА — ГАРАНТЫЯ ШЧАСЛІВАЙ БУДУЧЫНІ!

**Да Дня абароны дзяцей і Дня аховы навакольнага асяроддзя на базе гімназіі № 19 г. Мінска прайшла сустрэча міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя ХУДЫКА з маладзёжнымі пасламі і пасланцамі Мэт устойлівага развіцця.**

«Дасягнуць Мэт устойлівага развіцця без згуртавання грамадства ў гэтым кірунку немагчыма, а тым больш без цікавасці з боку моладзі. Міністэрства мэтанакіравана і пастаянна праводзіць такую работу для таго, каб маладое пакаленне разумела важнасць здароўя навакольнага асяроддзя, — распавёў Андрэй Худык. — У краіне з'явіўся маладзёжны інстытут, стварэнню якога пасадзейнічала і наша ведамства. Упэўнены, што гэта праца працягнецца, і ўсе 17 Мэт устойлівага развіцця будуць дасягнутыя».

Міністр адзначыў, што Беларусь уваходзіць у трыццатку краін-перадавікоў па выкананні МУР. І дасягнула максімальных вынікаў сярод дзяржаў СНД. Важна сказаць, што міністэрства заўсёды сур'ёзна вывучае міжнародны вопыт па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. У гэту работу ўцягнуты як дзяржаўныя органы, так і грамадскія арганізацыі. За Мінпрыроды замацавана выкананне сямі з іх.

На сустрэчы прайшла прэзентацыя работы рэсурснага цэнтра комплекснай падтрымкі адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця гімназіі № 19 г. Мінска. Педагогі і навучэнцы паказалі вынікі праектаў, што рэалізоўваюцца ў сферы экалагічнай адукацыі: «Гімназія без пластыку», «Майстэрня Эка+», «Другое жыццё старых рэчаў», «Для тых, у каго ёсць сэрца» і іншыя. А пасля юныя акцёры запрасілі міністра і гасцей на спектакль лялечнага тэатра, у якім усе дэкарацыі і лялькі зроблены рукамі навучэнцаў з другасных матэрыялаў. Хлопчыкі і дзяўчынкі паказалі выставу вырабаў з пластыкавых коркаў «Вечкі дабра і творчасці» і запрасілі ўсіх на заняткі дзіцячай навукова-даследчай лабараторыі «Геліяс».



**Дырэктар гімназіі № 19 Анатоль МУРАЎЁЎ** растлумачыў, якім чынам экалагічная накіраванасць установы адукацыі дапамагае ў дасягненні МУР: «Мы ўцягваем дзяцей у праектную дзейнасць, якая дазваляе ім праяўляць сябе і актыўна сацыялізавацца на гэтай базе. Ёсць праекты сацыяльнай накіраванасці, звязаныя з падтрымкай дзяцей з асаблівасцямі ў развіцці. Акрамя гэтага, мы рэалізавалі праект па энергазберажэнні для пажылых людзей».

Паводле слоў **намесніка дырэктара па вучэбнай рабоце Веры СЯЧКОВАЙ**, гімназія № 19 — адна з найстарэйшых навучальных устаноў, якая працуе ў галіне экалагічнай адукацыі. «Гэта рэсурсны цэнтр комплекснай падтрымкі адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця. У нас рэалізоўваецца больш за 70 праектаў пад адзінай назвай «Экагарод». У рамках ініцыятывы праходзяць дні экалогіі, экадэфіле, ёсць вялікая колькасць экалагічных майстэрань. На базе гімназіі дзейнічае метэастанцыя, даныя з якой ідуць у Белгідрамет, і нашы вучні ўжо ўмеюць карыстацца гэтай прыладай. Клуб для самых маленькіх «Геліяс» накіраваны на стварэнне ўласных метэастанцый першакласнікамі. Сёння іх паказалі міністру», — распавяла намеснік дырэктара.

Варта адзначыць, што ў гімназіі яшчэ ёсць калекцыя мінералаў, зімовы сад. На базе ўстановы таксама рэалізоўваюцца праекты дапамогі жывёлам, працуе клуб аматараў экалагічнага транспарту, які арганізоўвае велапрабегі ў Мінску. У рамках работы інтэрактыўнай пляцоўкі «Арт-квадрат» госці стварылі пано Мэт устойлівага развіцця, звязаных з аховай навакольнага асяроддзя. А члены Клуба аматараў экатранспарту «КЛЭТ» прапанавалі гасцям далучыцца да флэшмобу «Мы за чыстае паветра», у якім паказалі свае ўменні кіраваць экатранспартам (роварам, самакатам, сігвеем, монаколам) і ўрачыста прынялі Андрэя Худыка ў члены свайго клуба.

«Сёння мы наведалі эпіцэнтр экалагічнай агульнай сярэдняй адукацыі. Гімназія развівае праекты ў галіне рацыянальнага спажывання і вытворчасці, метэаралогіі, захавання марскіх экасістэм. Гэта вельмі дапамагае дасягненню ўсіх Мэт устойлівага развіцця, звязаных з экалогіяй. У маладзёжных паслоў МУР цяпер ёсць ініцыятыва аб юных валанцёрах МУР, куды прысвячаюцца школьнікі, якія захапляюцца гэтай сферай», — адзначыла **маладзёжны пасол Стэфанія-Віталія ВІННІЧАК.**

Напрыканцы мерапрыемства міністр узяў удзел у пасадцы саджанцаў сібірскага кедра, прымеркаванай да Года гістарычнай памяці. І, зразумела, для добрага настрою ад Мінпрыроды былі перададзены падарункі: гімназія атрымала ноўтбук, а ўсім навучэнцам дасталіся прысмакі. Акрамя гэтага, геалагічная калекцыя гімназіі папоўнілася новымі экспанатамі — базальту і туфу. Дарэчы, гэтыя горныя пароды з'яўляюцца новай і важнай для нашай краіны сыравінай з пункту гледжання імпартазамяшчэння.

**Ангеліна ВАРАТЫНСКАЯ.**
**Фота прэс-службы Мінпрыроды.**

# Па «зялёныя» веды!

## Экадружалюбны лад жыцця пачынаецца з экалагічнай адукацыі

**З дзяцінства ў людзей разам са звычкамі, культурай паводзін у грамадстве і іншымі рэчамі выбудоўваецца сістэма каштоўнасцяў, якую яны пранясуць праз усё жыццё. Менавіта таму вельмі важна як мага раней пасяліць у душы самых маленькіх жыхароў краіны любоў да прыроды, пачуццё адказнасці перад ёй, жаданне вывучаць і зберагаць навакольны свет. Сёння ў Беларусі дзейнічаюць розныя праекты ў галіне экалагічнай адукацыі і выхавання...**



### Сетка для юных эколагаў

Адукацыйны праект «Зялёныя школы» — гэта частка вялікай сеткі экашкол, якую ствараюць у розных краінах свету для павышэння экалагічнай інфармаванасці грамадскасці. Праграма па іх стварэнні стартавала ў Беларусі ў 2010 годзе. У 2018-м яна атрымала новае развіццё. Сёння сертыфікатамі «Зялёная школа» валодаюць 148 устаноў адукацыі, ці каля 4 % ад усёй колькасці школ краіны. Яшчэ каля 500 устаноў уцягнуты ў гэты працэс.

Гэты комплексны адукацыйны праект накіраваны на фарміраванне ў навучэнцаў каштоўнаснага стаўлення да прыроды, павышэнне ўзроўню экалагічнай скіраванасці адукацыі, інфармаванасці моладзі па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, выхаванне адказных адносін падрастаючага пакалення да прыроды, фарміраванне экалагічна правільных паводзін.

Па ўсёй краіне ствараецца сетка «зялёных школ», укараняецца эфектыўная адукацыйная мадэль у галіне экалагічнай скіраванасці адукацыі з прыцягненнем і актыўным удзелам не толькі педагогаў, навучэнцаў, іх законных прадстаўнікоў, але і тэрытарыяльных органаў Мінпрыроды, рэгіянальных і мясцовых органаў улады.

### Заданні для дапытлівых

У рамках праекта кожнаму ўдзельніку прапаноўваецца выканаць набор заданняў, аб'яднаных у шэсць напрамкаў:

• Біяразнастайнасць — вывучэнне відавой разнастайнасці раслін і жывёл прыроднага наваколля ўстановы адукацыі і спосабаў яго павелічэння;

• Энергазберажэнне — вывучэнне структуры энергаспажывання дома і ва ўстанове адукацыі і спосабаў яго скарачэння;

• Водазберажэнне — вывучэнне кірункаў выкарыстання вады ў школе і дома і спосабаў змяншэння яе расходу;

• Якасць атмасфернага паветра — вывучэнне ступені забруджвання атмасфернага паветра

**Далучайцеся да руху, у якім удзельнічае больш за 40 000 школ ва ўсім свеце!**

і дзеянні па мінімізацыі яго забруджвання ў мікраараёне ўстановы адукацыі;

• Абыходжанне з адходамі — аналіз крыніц утварэння адходаў, вывучэнне спосабаў іх мінімізацыі, перапрацоўкі і другаснага выкарыстання;

• Інфармацыйна-экалагічныя мерапрыемствы — акцыі, выстаўкі, конкурсы, экалагічныя ініцыятывы, экалагічная асвета для мясцовага насельніцтва.

Кожная з устаноў пасля выканання па сваім выбары вызначанай колькасці заданняў можа атрымаць статус «Зялёная школа».

Інфармацыю пра зробленыя заданні ўдзельнікі праекта размяшчаюць у спецыяльнай аднайменнай укладцы, створанай на сайце ўстановы адукацыі ці іншай установы, арганізацыі. Каб атрымаць статус «Зялёная школа», неабходна таксама выканаць астатнія ўмовы, указаныя ў Палажэнні аб рэалізацыі адукацыйнага праекта «Зялёныя школы».

Статус «Зялёная школа» прысвойваецца на тры гады, а пасля трэба будзе яго пацвярджаць.

Установам заўсёды на дапамогу прыйдуць рэсурсныя цэнтры праекта (рэспубліканская і абласныя), у тым ліку Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства. На сайце апошняга можна знайсці шмат карыснай інфармацыі.

### «Зялёныя класы беларускай сталіцы»

Так называецца праект, які ўжо некалькі гадоў рэалізоўваецца Мінскім гарадскім камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Цэнтрам экалагічнага выхавання і развіцця. Ён накіраваны на падрыхтоўку новага пакалення мінчан, якія валодаюць высокім узроўнем экалагічнай культуры з самага ранняга ўзросту.

«Зялёныя класы» ствараюцца на базе ўстаноў адукацыі, якія знаходзяцца недалёка ад «Горада птушак» (Ленінскі раён сталіцы) і іншых экалагічных сцяжынак. Першыя з класаў былі створаны ў пачатковай школе № 29 г. Мінска. Паступова іх колькасць вырасла да 50. Як абяцаюць стваральнікі праекта, у найбліжэйшы час зялёныя класы адкрыюцца і ў іншых школах горада, якія найбольш эфектыўна працуюць у экалагічным напрамку.

Як жа атрымаць статус «зялёнага класа»?

Трэба, каб ва ўжо існуючым у школе класе 10 чалавек захацелі стаць «зеленакласнікамі»:

— вывучаць прыроду "праз птушак";

— рабіць рэальны ўнёсак у ахову прыроды малой радзімы, беручы ўдзел у цікавых праектах;

— падарожнічаць па запаведных месцах і экалагічных сцежках;

— і проста навучыцца атрымліваць задавальненне ад зносін з прыродай.

Аўтары праекта падрыхтавалі для яго ўдзельнікаў шмат цікавых і карысных мерапрыемстваў. Так, на тэрыторыях экалагічных сцежак Мінска праходзяць эколага-асветніцкія і выхаваўчыя мерапрыемствы (экскурсіі, святы, працоўныя акцыі і іншыя), у тым ліку прымеркаваныя да міжнародных экалагічных дат. Для ўстаноў сталіцы праводзяцца навучальныя і інфармацыйныя семінары, круглыя сталы. Ствараюцца таксама распрацоўкі па арганізацыі мэтавых (сезонных) экскурсій для канкрэтных экасцежак. Фарміруюцца аб'яднанні па інтарэсах (клубы), максімальна арыентаваныя на заняткі ва ўмовах прыроды, з максімальнай колькасцю экскурсій, забяспечаныя неабходным абсталяваннем (біноклі, водныя сачкі, вызначальнікі жывёл і раслін).

Дырэктар Цэнтра экалагічнага выхавання і развіцця Руслан Шайкін рэзюмуе: «Наша задача — захаваць прыроду горада Мінска і перадаць яе ў рукі наступнага пакалення, якое ўжо расце і выхоўваецца ў «Зялёных класах беларускай сталіцы».

**Таццяна ІВАНОЎСКАЯ.**

**Праект «Зялёныя класы беларускай сталіцы» налічвае больш за 50 класаў у розных кутках горада.**



# ЯНЫ ТАКІЯ РОЗНЫЯ!

## Чым і чаму мужчыны адрозніваюцца ад жанчын? І наадварот...

**Жанчыны не стрымліваюць эмоцый, і калі радуюцца, то ў поўную сілу. Мужчыны больш стрыманыя і радзей адчуваюць хвіліны шчасця. Вучоныя неаднаразова імкнуліся высветліць, чаму мужчыны адрозніваюцца ад жанчын. Але нават калі перачытаць мноства прац на гэту тэму, усё роўна зразумець да канца, у чым заключаецца міжпалавая розніца, дастаткова складана. Чым мы адрозніваемся на ўзроўні фізіялогіі і псіхалогіі, разважаем разам з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гуменам ГУРБАНІДЖАДАМ.**



— Мужчына і жанчына — дзве розныя істоты, якія ў першую чаргу дапаўняюць адна адну, але кожны мае свае функцыі з пункту погляду біялогіі. Калі мужчына ў чымсьці мацнейшы, дзесьці ёсць і яго слабае месца. У тым, як правіла, яго апярэджвае жанчына. І наадварот. У залежнасці ад таго, якія функцыі мы выконваем, прырода дала нам пэўныя ўласцівасці.

Мужчына — носьбіт храмасомы XX, а жанчына — XY, і гэта дае нам магчымасць захоўваць «відавую разнастайнасць». Жанчына — захавальніца геннага матэрыялу, а мужчына, як бы груба ні гучала, лічыцца «расходным матэрыялам».

***— Мужчына адрозніваецца ад жанчыны найперш фізічнай сілай. Чым гэта можна растлумачыць?***

— Кожная мышца складаецца з белых і чырвоных валокнаў, якія і даюць ім сілу. Белыя валокны разлічаны на больш шпаркую, але кароткую дыстанцыю, яны хутка стамляюцца. Чырвоныя, у сваю чаргу, — на больш доўгатэрміновую работу, але сіла іх крыху меншая. У мужчыны больш белых валокнаў, у жанчыны — чырвоных. Таму мужчыны больш моцныя, а жанчыны — больш вынослівыя. Адсюль такая прымаўка, што мужчына падымае цяжэй, а жанчына носіць даўжэй.

Так склалася эвалюцыйна са старажытных часоў, калі мужчына быў паляўнічым, а жанчына сядзела ў пячоры і займалася хатнімі справамі. Натуральна, для мужчыны патрэбна было хутка бегаць, каб злавіць дабычу, а жанчына дома выконвала больш марудную работу, якая патрабавала менш фізічных нагрузак. Таму жанчына можа доўга вязаць шалік, а мужчыну праз 10 хвілін гэта надакучыць.

***— Атрымліваецца, што дзяленне на моцны і слабы пол абсалютна апраўдана?***

— Я не быў бы такім катэгарычным. Напрыклад, жаночы арганізм больш устойлівы да крывацёку па прычыне фізіялагічных асаблівасцяў: жанчыны штомесяц страчваюць кроў. Гэтак жа, як і адразу пасля родаў. Праўда, лічыцца, што на працягу дзевяці месяцаў яе аб'ём назапашваецца і павялічваецца на 1 літр — такім чынам арганізм рыхтуецца да страт. Нягледзячы на гэта, калі мужчына і жанчына атрымліваюць аднолькавае раненне, мужчына загіне хутчэй, а ў жанчыны нашмат больш шанцу дачакацца меддапамогі.

***— Шмат спрэчак наконт інтэлекту мужчын і жанчын. Часам здаецца, што жанчыны саступаюць у разумовых здольнасцях моцнай палове...***

— Калі не было сучаснага абсталявання, мозг вымяралі па памеры і вазе. І сапраўды, мозг жанчыны крыху меншы за мужчынскі — на 140—200 грамаў. З гэтага рабілі памылковую выснову, што калі аб'ём мозгу больш, мужчына разумнейшы. Сучасная навука з іроніяй глядзіць на гэта. У слана мозг яшчэ больш, але ён не разумнейшы за чалавека. Калі суадносіць аб'ём мозгу да цела, то ў такой пароды, як чыхуахуа, таксама памер мозгу даволі вялікі, аднак гэта дастаткова неразумны сабака. Такім чынам, памер мозгу не з'яўляецца крытэрыем, ад якога варта адштурхоўвацца ў ацэнцы разумовых здольнасцяў.

З дапамогай сучаснага абсталявання даследчыкі высветлілі, што шэрага рэчыва, а гэта тое, што дае нам інтэлект, у мужчын на 20 % больш. Затое нейронныя сувязі паміж двума паўшар'ямі галаўнога мозгу ў жанчыны развіты лепш — у мужчыны яны распаўсюджаны пераважна ўнутры аднаго паўшар'я. Насамрэч можна сустрэць як разумных мужчын, так і не вельмі, тое ж самае датычыцца і жанчын. Па інтэлекце мы не моцна адрозніваемся адно ад аднаго.

***— Аднак сярод вядомых вучоных мужчын усё ж такі больш...***

— Сапраўды, вялікія адкрыцці пераважна рабілі мужчыны. Калі жанчына больш засяроджана на хатняй рабоце, выхаванні дзіцяці, праблемах сям'і, натуральна, у яе менш застаецца часу, каб займацца навукай.

На некаторых работах жанчыны больш эфектыўныя, чым мужчыны. Напрыклад, нюх і смакавыя ўласцівасці ў жанчыны нашмат больш развітыя, чым у мужчыны. Найлепшыя дэгустатары віна адназначна жанчыны. Быў міф: быццам калі жанчына спускаецца ў вінны склеп, віно пракісне. Ні адзін вінаўладальнік не хацеў абанкроціцца, і жанчын да гэтага занятку не дапускалі. Насамрэч жанчыны могуць нашмат лепш адрозніць якасць віна, чым мужчыны.

Лічыцца, што першым доктарам была жанчына, а не мужчына. Мужчына хадзіў на паляванне, раніўся, прыносіў здабычу, а жанчына ўмела лячыць яго раны.

***— У палітыцы мужчын таксама больш. Лідарства — мужчынская опцыя?***

— Калі лічыць, што нашы продкі былі малпамі, то звычайна ў малпаў лідарам з'яўляецца самец. Сапраўды, раней у палітыцы лідзіравалі мужчыны. Апошнім часам колькасць жанчын, якія паспяхова паказваюць сябе ў палітыцы і былі прэзідэнтамі розных краін, дастаткова вялікая. Цяпер на гэта не зважаюць, але генетычна лічыцца, што мужчына мусіць быць лідарам. Хоць і жанчыны нядрэнна сябе ў гэтым зарэкамендавалі.

***— Нягледзячы на роўнасць, атрымліваецца, што ў гэтым свеце верхаводзяць мужчыны...***

— Жанчыны часта садзейнічаюць гэтаму. Каб зняць частку нагрузкі, кажуць: мы жанчыны, мы слабыя і неразумныя. Гэта называецца спекуляваць абставінамі на карысць сабе. Ёсць шэраг работ, шкодных для жаночага здароўя. Зразумела, што жанчын туды не возьмуць.

***— Мужчыны і жанчыны думаюць па-рознаму?***

— З аднаго боку, жанчыны больш любяць працаваць калектыўна і гэтак жа думаць. Ім усюды патрэбна падтрымка сяброўкі. Мужчыны больш самастойныя. З іншага — жанчыны, хоць і робяць нешта разам, унутры ёсць вялікая канкурэнцыя і асаблівая псіхалогія ўзаемадзеяння. Калі на вечарынцы выпадкова аказаліся дзве жанчыны ў аднолькавых сукенках, яны могуць стаць ворагамі да канца жыцця. Мужчыны ў аднолькавым адзенні, наадварот, хутчэй за ўсё ўспрымуць гэта з гумарам, будуць яшчэ доўга ўспамінаць як кур'ёз. Такім чынам, здавалася б, ёсць жаночая салідарнасць, ды жаночага сяброўства не існуе.



Калі жанчыне важнае кантактаванне, то для мужчыны — яго вынікі. Таму жанчыны могуць бясконца размаўляць па тэлефоне. Жанчына, калі сама сябе слухае, лепш аналізуе сітуацыю. І каб разабрацца ў нейкай сваёй праблеме, ёй дастаткова паразмаўляць з сяброўкай.

У адносінах да вырашэння розных задач жанчына іх дэталізуе і пачынае вырашаць па частках. Мужчына праблему бачыць цалкам. Зыходзячы з гэтага, калі нешта трэба вырашаць зараз і неадкладна, мужчынскі падыход лічыцца больш эфектыўным. У жанчыны больш развітая інтуіцыя. Калі трэба прагназаваць падзею, да гэтага больш здатны жаночы мозг.

***— Калі інтэлект мужчыны і жанчыны не моцна адрозніваецца, чаму тады жанчыны нярэдка робяць неразумныя ўчынкі? Гэта яшчэ называюць жаночай логікай...***

— Гэта звязана з жаночымі гармонамі, з-за чаго жанчына больш эмацыянальная. Калі мужчына абапіраецца на пэўныя факты, то жанчына — на эмоцыі. І гэта тое, што не дае ёй скокнуць вышэй за сваё мысленне. Уявіце, яна з розных бакоў падвяргаецца эмацыянальнаму ўздзеянню: усё слухае, бачыць, нюхае, разумее! І гэтыя эмоцыі падаўляюць рацыянальнае ўспрыманне рэчаіснасці. Спрацоўвае хуткае мысленне, якое звязана з пачуццямі. Жанчына не ставіць на першае месца факты і лагічную сувязь паміж падзеямі. З пункту погляду мужчыны, гэта незразумела, яны губляюцца часам з-за такіх нелагічных паводзін. І часта вызначаюць гэта як «яна псіханула».

Але гэтае эмацыянальнае ўспрыманне замест лагічнага часам карыснае, так задумана прыродай, каб працягваўся чалавечы род. З'яўленне дзіцяці на свет з пункту погляду камфорту жанчыны ўвогуле нелагічнае. Любы свядомы чалавек стане перад матуляй на калені і мусіць паважаць яе, бо з'яўленне дзіцяці на свет — вялікая рызыка для жаночага здароўя. Цяжарнасць — гэта таксікозы, месяцы з дадатковым грузам і трыванне нязручнасцяў. Раней шмат жанчын гінула падчас родаў. Пасля — кармленне і бяссонныя ночы. Калі мужчыну даць груз і папрасіць насіць яго 9 месяцаў, ён ніколі не пагодзіцца! Таму эмацыянальны стан, які падаўляе лагічнае мысленне, падштурхоўвае жанчын да тых учынкаў, дзякуючы якім мы з'яўляемся на свет.

Мы па-рознаму перажываем і стрэсавыя сітуацыі. Мужчына — як запалка: рэзка загараецца і хутка згасае. У жанчыны — наадварот: стрэс і ўзровень адпаведных гармонаў захоўваецца больш працяглы час. Таму, калі жанчына атрымала стрэс, нават калі фактару, які яго выклікаў, больш не існуе, яна доўга адыходзіць. Мужчына больш устойлівы да кароткага стрэсу, а жанчына — да доўгага. Хранічныя стрэсавыя станы жанчына больш цярпліва пераносіць, а мужчына зламаецца. Псіхолагі гэта звязваюць з выхаваннем дзіцяці. У першы год яго жыцця пастаянны плач, бяссонныя ночы, і гэты хранічны стрэс варта трываць. Да яго жанчына больш устойлівая і лепш пераносіць.

***— У чым жанчыны пераўзыходзяць моцную палавіну?***

— Вуха жанчыны нашмат вастрэйшае. Як і адчувальнасць да пахаў. Участак галаўнога мозгу, які адказвае за слых і нюх, нашмат дакладней працуе ў жанчын. Нюх патрэбны, каб пазнаць сваё дзіця. Жанчына, якая нарадзіла і панюхала сваё дзіця, ніколі яго не пераблытае. Па паху жанчына вызначае і імунітэт мужчыны. Яна ўлоўлівае на ўзроўні падсвядомасці асаблівасці паху мужчыны і вызначае такім чынам яго імунітэт. Мужчына з мацнейшым імунітэтам больш жаданы для яе. Гэта спрацоўвае на ўзроўні падсвядомасці.

Слых у жанчыны таксама вастрэйшы, бо жанчына са старажытнасці для абароны дзіцяці мусіць чуць самыя прыглушаныя гукі накшталт шыпення, каб своечасова заўважыць ядавітую змяю, скарпіёна, любую небяспеку — і выратавацца.

У жанчын больш развіты бакавы зрок. Калі мужчына хоча паглядзець на жанчыну, якая яму падабаецца, ён паверне галаву і такім чынам сябе заўсёды выдасць. Жанчына ж паглядзіць бакавым зрокам і незаўважна з галавы да ног ацэніць мужчыну. Насамрэч мужчына паляўнічы, ён глядзіць наперад і бачыць мэту. Жанчына бачыць усё, што адбываецца навокал, гэта таксама звязана з абаронай патомства. Сярод дзяцей, якія трапляюць пад машыны, па статыстыцы больш хлопчыкаў, чым дзяўчынак. Хлопчык глядзіць толькі наперад, для яго мэта — супрацьлеглы бок вуліцы, куды ён мусіць трапіць. А ў дзяўчынак развіты бакавы зрок, яна бачыць, што адбываецца вакол.

Жаночы зрок разлічаны на блізкія работы, яна іх лепш выконвае і рэчы бачыць больш дэтальна. У мужчыны зрок накіраваны ўдалечыню. Калі мужчына нешта згубіў, жанчына хутчэй гэта дапаможа знайсці.

Як вядома, жанчына больш цікаўная. Калі яе пакінуць у нейкім пакоі, яна абавязкова вывучыць усё, што там знаходзіцца. Гэта зноў-такі звязана з эвалюцыяй: пакуль мужчына быў на паляванні, яна даследавала пячору.

Памяць у жанчыны лепшая, аднак за кошт уздзеяння эстрадыёлу пасля клімаксу яна пагаршаецца.

Жаночая скура больш адчувальная і ўспрымальная да тактыльных адчуванняў, у мужчын менш рэцэптараў. Аднак жанчына хоць і больш успрымальная, але і больш цярплівая да болевага сіндрому. Разам з тым, у мужчынскай скуры ўтрымліваецца больш калагену і яна пазней старэе, сальныя залозы лепш развітыя, і скурны тлушч пры змешванні з потам лічыцца найлепшым ласьёнам для мужчынскай скуры. У жанчыны старэнне скуры адбываецца хутчэй.

Працягласць жыцця ў жанчын большая, чым у мужчын. Ёсць на гэты конт розныя тэорыі. З пункту погляду біялогіі мужчына — расходны матэрыял, яго задача — «зрабіць» дзіця. Напрыклад, самка багамола адкусвае пасля спарвання галаву самца. Адначасова трэба разумець, што роля бабулі ў выхаванні ўнукаў надзвычай вялікая: у яе маецца каласальны вопыт, і яна мусіць перадаць яго сваёй дачцэ. Як бы там ні было, жанчыны жывуць у сярэднім даўжэй.

Насамрэч нельга сказаць, хто — мужчына ці жанчына — больш дасканалая істота. У кожнага свае функцыі, зыходзячы з біялагічных задач. І мы дапаўняем адно аднаго. У нас розныя мысленні і візуальныя ўспрыманні. Мужчына глядзіць з пункту погляду фактаў, жанчына — эмоцый. Гэта дзве разумныя і моцныя біялагічныя істоты. У ЗША, калі хапала мужчынскай працы, была рэклама, што жанчына мусіць сядзець дома і выхоўваць дзяцей. А калі эканоміцы, якая імкліва развівалася, спатрэбілася і жаночая праца, з'явілася рэклама, што жанчыны круцяць гайкі на заводзе і стаяць плячом да пляча з мужчынам. Вось вам і слабы пол.

**Алена КРАВЕЦ.**

Пракаветнае

# КВЕТКА ПЕРУНА

## Іван Кірчук запрашае ў чароўны свет беларускіх абрадаў, песень і казак



**У жыцці заўсёды ёсць месца цуду, упэўнены фалькларыст, музыкант, мультыінструменталіст, кампазітар, выкладчык, лідар гурта «Этна-трыа Троіца» Іван КІРЧУК. Дзякуючы нечаканым сустрэчам, дзівам захаваным нотным запісам, падкінутым ідэям назапашаныя за амаль чатыры дзесяцігоддзі экспедыцый веды аб народнай культуры склаліся ў цудоўныя кнігі, прэзентацыя якіх днямі прайшла ў сталічнай «Акадэмкнізе».**



«Кветка Перуна» — гэта каляндарна-абрадавы даведнік, які падказвае, як можна працаваць з фальклорам. У кнізе змешчаны сцэнарыі для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту, тэатралізаваныя святы і абрады для вучнёўскіх і студэнцкіх калектываў, а таксама сцэнарыі, якімі могуць карыстацца прафесійныя калектывы. З дапамогай кнігі можна ажывіць народныя казкі, разам з моладдзю пабываць на восеньскім кірмашы, на беларускім вяселлі, адзначыць Масленіцу, Багач і Юр'е альбо зрабіць тэатралізаваныя прадстаўленні паводле старажытных легенд і паданняў, гульняў, абрадаў, свят. Гэта кніга — вынік шматгадовых пошукаў даследчыка.

Другая навінка — «Гарады ўзыходжанняў» — фолк-фэнтэзі. Апісаных у ёй абрадаў і рытуалаў вы не знойдзеце ў рэальным жыцці, але, тым не менш, праз прыдуманы сусвет Іван Кірчук пастараўся перадаць тыя ідэі, якія ўзяў з фальклору: «Кожная прастора абжытая, хоць і знаходзіцца за межамі чалавечага позірку. Так даганяем мы па спіралі Часу родных: крок — сустрэча, крок — асоба, і так да бясконцасці. Мы ўсе ідзём па прыступках Жыцця. Штодзень, штогод: хто — да Бога, хто — у Космас. Кожны сам выбірае свой шлях. Кожная прыступка той нябачнай лесвіцы — нашы далёкія Прашчуры... І мы толькі тады цвёрда стаім на гэтых прыступках Часу, калі ёсць тая нябачная падтрымка Продкаў. Слава Роду, які ідзе ўпэўнена і правільна па Прыступках!»

### Жыццё сярод песень

Іван Кірчук нястомна збірае і папулярызуе фальклор. Ён — аўтар рэканструяваных абрадаў і свят, яго працы трансліраваліся на тэлебачанні і радыё. На базе Мінскага вучылішча мастацтваў ён ствараў фальклорныя ансамблі, якія з канцэртамі выступалі на замежных фестывалях. Даследчык сабраў этнаграфічны музей з прадметамі побыту беларусаў, лялькі і маскі, мае багатую калекцыю музычных інструментаў з усяго свету. І нават гэтыя прадметы ў яго — яшчэ адна крыніца, праз якую можна даносіць інфармацыю пра здабыткі народнай культуры. У створаных ім этналабараторыі праходзяць заняткі па павышэнні кваліфікацыі прадстаўнікі розных сфер (музыканты, рэжысёры, кіраўнікі калектываў, мастакі і інш.). Яны бачаць, як рэчы ажываюць, распавядаюць, уражваюць. Чароўныя гукі музычных інструментаў дапаўняюць аповед пра здабыткі продкаў. Так, праз фальклор перакідваецца масток паміж сучаснікамі і папярэднікамі. Часта госці і вучні просяць матэрыялы, сцэнарыі, хоць, здавалася б, самі жывуць сярод песень. Магчыма, ім у тым ліку не хапае падказкі, як прыстасаваць народную спадчыну да новых умоў.

Нават прэзентацыю сваіх кніг музыка выкарыстаў, каб крыху прыадкрыць адшуканыя ім у экспедыцыях сакрэты продкаў.

— У дзяцінстве і маладосці я ніколі не планаваў, што буду займацца беларускай музыкай, фальклорам, абрадамі, рэканструкцыяй свят, — прызнаецца музыкант. — Мой бацька працаваў у будаўнічай кампаніі, якая рабіла рамонт у лідскім музычным вучылішчы, і таму мяне адправілі туды вучыцца. Я скончыў вучылішча як кіраўнік акадэмічнага хору і планаваў пасля войска ісці вучыцца ў кансерваторыю, праслухоўваўся ў прафесара Роўды. У той час кожны завод, фабрыка мелі народныя хары, і яны ўсе спявалі неяк аднолькава, у адной манеры. Сапраўдным адкрыццём стаў для мяне канцэрт вядомага ў той час калектыву Дзмітрыя Пакроўскага з маскоўскай кансерваторыі, які праязджаў у 1980 годзе праз Мінск. Яны паказалі манеру спеваў на поўначы, поўдні, іншых рэгіёнаў, усё выконвалася па-рознаму. Для мяне гэта быў нейкі штуршок, падказка. Сёння мы ведаем, што ў Беларусі ёсць шэсць этнаграфічных рэгіёнаў, дзе захоўваюцца свае адметныя асаблівасці. На жаль, у нас да гэтага часу няма кружэлак, на якіх можна паслухаць песні, казкі, інструментальную музыку. Хоць у Акадэміі навук, дзе я быў аспірантам, маецца вялікая колькасць запісаў. Ёсць яны і на рэспубліканскім радыё. Можна было б запісаць усю Беларусь. Добра было б, каб дзяржава дапамагла ў гэтай справе.

Іван Кірчук згадаў адну са сваіх першых экспедыцый у 1982 годзе. Яму трапілася бабулька, якая спявала з 10 гадзін раніцы да гадзіны ночы. Гэта песні яе маці, што моцна закранула даследчыка. Ён запісваў фальклор у розных краінах свету, а вось да сваіх родных прыехаў, толькі калі засталіся мама і хросная (а ў яго дзеда Тамаша па лініі маці было 14 дзяцей!). Таму маладым даследчыкам на сваіх лекцыях Іван Іванавіч раіць у першую чаргу пачынаць пошукі з уласнай сям'і, запісваць бацькоў, дзядоў, цётак...

Усё, што здабыта ў час экспедыцый, ідзе ў справу. Матэрыялы выкарыстоўваліся падчас заняткаў са студэнтамі, у «Троіцы» ці сольных праграмах. Ужо 20 гадоў Іван Кірчук выступае з монаспектаклем «Дарожка мая», дзе паказана жыццё беларуса ад нараджэння да смерці, падаецца абрады і святы. Задзейнічана каля 50 музычных інструментаў, маскі, лялькі. Толькі ў мінулым годзе, нягледзячы на ковід, монаспектакль быў паказаны 30 разоў. Дарэчы, ён прайшоў таксама ў Канадзе, у Казані, у Літве. Спектакль перыядычна шліфуецца, прырастае інфармацыяй, здабытай у час падарожжаў. Летась, нягледзячы на ковід, музыка паспеў запісаць бабулю з Крупак, якой было 96 гадоў. А на пачатку гэтага года яе сын патэлефанаваў і паведаміў: «Маёй пявунні ўжо няма». Але яе песні могуць увайсці ў спектакль і ў новы альбом, які Іван Кірчук плануе запісаць.

### «Ягада з ягадою сакаціліся...»

Іван Кірчук згадаў, як пасля ўдалай экспедыцыі прыляцеў у Акадэмію навук і пахваліўся, што запісаў сто песень. А яму адчынілі фоналабараторыю, дзе шмат было шафаў, у якіх стаялі бабіны, магнітныя стужкі са шматлікімі запісамі. І ён пачаў такія скарбы вывучаць, спяваць. Разам са студэнтамі рабіў рэканструкцыі абрадаў і свят. У 1999-м выдаў кампакт-дыск «Спадчына загінулых вёсак», у якую ўвайшлі песні, запісаныя ў экспедыцыях разам з дудкамі, акарынамі, жалейкамі, лірай, гуслямі, дудой. Да «Троіцы» ў яго быў ансамбль «Дзіва», які рабіў цікавыя і вельмі складаныя распевы. Калі калектыў удзельнічаў у фестывалі «Залаты яблык», кіраўнік кубанскага казацкага хору падняўся на сцэну, пачаў цалаваць удзельніц-дзяўчат і пытацца: «Скуль вы? Я такіх песень ніколі не чуў». А гэта былі нашы беларускія песні. Проста людзі ўжо прызвычаіліся спяваць па нотах, дзе ўсё распісана, а тут ішла імправізацыя, галасы зліваліся.

— На жаль, наша краіна не мае тэатра фальклору, рытуальнага тэатра. Тое, што мы бачым на сцэне ў горадзе, напрыклад, Купалле ці Каляду, больш нагадвае нейкі канцэрт мастацкай самадзейнасці. Мы не можам зазірнуць, як тое рабілі нашы продкі, — заўважае Іван Кірчук.

І зацягвае адну з вясельных песень «Ягада з ягадою сакаціліся...». Добра было б, каб падобныя мелодыі гучалі на сучасных вяселлях. Усё ж у продкаў яны мелі рытуальную функцыю, з'яўляліся абярэгам.

Сучасныя майстры народных інструментаў сцвярджаюць, што музыка, гукі здольныя лячыць. На жаль, каранёвыя рэчы, на якіх раслі нашы продкі, сёння для нас — нейкае дзіва.

### Крылы музыкі

Прэзентацыя кніг ператварылася ў міні-канцэрт. Мызыкант знаёміў з некаторымі з інструментаў са сваёй калекцыі (а ў яго, дарэчы, сёння іх больш чым дзве з паловай сотні). За кожным інструментам — своя гісторыя. Так, у яго калекцыі ёсць варганы з Японіі, Кітая, Славеніі, Расіі, Венгрыі, зробленыя айчынным майстрам. І называецца па-беларуску такая штука дрымба. Звычайна, калі слухачы чуюць спецыфічны гук, лічаць, што дадзены інструмент звязаны выключна з народамі Поўначы. Але музейшчыкі казалі Івану Кірчуку, што такія інструменты знаходзілі ў нашых старажытных курганах. «Беларускія майстры робяць цудоўныя інструменты з дрэва, гліны. Але дзе з імі выступаць? Нам патрэбны фестывалі, пляцоўкі. Музыка продкаў павінна займаць на іх пачэснае месца», — заўважае музыкант. Сапраўды, спадчынай, што нам засталася, можна здзіўляць слухача як айчыннага, так і замежнага. Гурт «Троіца» праехаў сотню міжнародных фестываляў розных куткоў свету і бачыў, як публіка рэагуе на беларускі фальклор. Людзі і здзіўляліся, і захапляліся, і плакалі. Напрыклад, у Эстоніі публіку пазнаёмілі з песняй, якую спявала дзяўчына перад вяселлем «Не дай мяне, матачка, у чужы край». Адзін са слухачоў прыгадаў, як такое спявала яго маці, і пачаў плакаць. «А што трэба праспяваць сучаснай моладзі, каб сляза прайшла? — пытаецца музыкант. — Увявіце: раней песні перадаваліся тысячы гадоў. А сёння людзі не маюць такога падмурка. Спяваюць песні, якія не маюць такой моцы. Таму, калі я да гэтага матэрыялу звяртаюся, маю крылы і лётаю. Для мяне гэта фальклорная служба. Я іду на яе як ксёндз ці бацюшка на сваю службу, бо ведаю, што ў гэтым абрадзе трэба адно паказаць, у іншым — другое. Я ўпэўнены: фальклор будзе перадавацца, можа, праз пакаленні. Прыйдуць тыя людзі, якія хочуць не хочуць, але будуць гэтым займацца. Продкі не дазволяць, каб усё загінула».

Фальклор — і шлях да вяртання мовы. Яна можа засвойвацца, калі дзеці і моладзь удзельнічаюць у абрадах, святах. Да таго ж, у беларускім фальклоры шмат паўтораў. Першы раз можна пачуць словы, а другім разам — з усімі праспяваць: «Зялён явар, кудравы».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

---




# 140-ГОДДЗЕ ЯНКІ КУПАЛЫ

## Якія мерапрыемствы падрыхтаваў музей

**На летнія месяцы прыпадае шмат «купалаўскіх» дат — дзень нараджэння і дзень смерці паэта, купальская ноч. Сёлета святкуецца 140-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. «Звязда» сустрэлася з Ганнай Галінскай, дырэктарам Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, каб даведацца аб усіх мерапрыемствах, якія чакаюць нас наперадзе.**

Сустрэча з Ганнай Васільеўнай адбылася 1 чэрвеня, у Міжнародны дзень аховы дзяцей. Будынак музея быў запоўнены вучнямі малодшых класаў. Падчас адмысловых музейных заняткаў «Адпачні ЯК» маленькім наведвальнікам распавялі аб тым, як праводзіў вольны час Янка Купала. Паэт быў заўзятым шахматыстам, любіў выбрацца з вудамі на рэчку ці ў лес у грыбы. Супрацоўнікі музея пазнаёмілі з вершамі класіка, адрасаванымі дзецям, і дазволілі адчуць сябе героямі самага знакамітага з іх — «Хлопчык і лётчык», — прымераўшы сапраўдны парашут.

— Янка Купала — гасцінны гаспадар, — каментуе адзін з дзяцей.

— Так, ты правільна ўсё запомніў, — усміхаецца экскурсавод.

Дырэктар музея распавяла, што менавіта такія заняткі падрыхтаваны музеем для дзіцячай і сямейнай аўдыторыі ў летні час:

— Акрамя класічнай аглядной экскурсіі па стацыянарнай экспазіцыі, заўсёды хочацца паказаць наведвальнікам нешта новае, — адзначыла Ганна Галінская.

### Мерапрыемствы ў сталіцы

— Дзейнасць Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы ў 2022 годзе скіравана на арганізацыю і правядзенне юбілейных мерапрыемстваў, прымеркаваных да 140-годдзя з дня нараджэння класіка, а таксама тых памятных дат, якія звязаны з яго жыццём і творчасцю. Найперш са 100-годдзем выхаду чацвёртага паэтычнага зборніка «Спадчына», 110-годдзем першай сустрэчы Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Мы плануем правесці шэраг мерапрыемстваў пад агульнай назвай «Купалаўскія дні». У Год гістарычнай памяці актуальна, што 24 чэрвеня іх праграму распачне адкрыццё сумеснага выставачнага праекта ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Было вырашана, што мы зробім выставу пад назвай «Шчаслівых перамог, свабодны мой народзе!». Палымянае публіцыстычнае слова станавілася ў гэтыя трывожныя дні асноўным жанрам, у якім пісаў Янка Купала. Як прыклад — артыкулы «Не будзе беларус рабом нямецкіх баронаў!», «Германскі фашызм — люты вораг беларускага народа», якія выкрываюць сапраўдную сутнасць гітлераўскай палітыкі, скіраванай на вынішчэнне славянскіх народаў. Вершы класіка, напісаныя ў першыя месяцы вайны, незавершаная балада «Дзевяць асінавых колляў» — гэта ўсё будзе дапаўняцца матэрыяламі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай

Ратаванне святыні

# ЯФРЭМ САКАЛОЎ: «ТРЭБА ПАЙСЦІ НАСУСТРАЧ ВЕРНІКАМ...»

**Гэта сёння кожны, хто толькі пажадае, можа светла паўзіраццa ў Петрапаўлаўскі сабор — кафедральны сабор Гомельскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы. А былі ў гісторыі гэтага храма і іншыя часіны...**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Закладзены 18 кастрычніка 1809 года на тэрыторыі, якой валодаў Мікалай Румянцаў, сабор будаваўся з 1809 да 1819 года. Размешчаны храм ва ўнікальным месцы на высокім мысе на беразе ракі Сож. Канчатковае будаўніцтва было завершана ў 1824 годзе... Каля 30 гадоў (1902—1930 гг.) настаяцелем храма з'яўляўся Аляксандр Зыкаў (1865—1931). Ён нарадзіўся ў горадзе Угліч, на Яраслаўскай зямлі. Закончыў Яраслаўскую духоўную семінарыю. Затым — у 1892 годзе — Маскоўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя. Працаваў выкладчыкам і бібліятэкарам у Магілёўскай духоўнай семінарыі. Сан святара прыняў у 1901 годзе... Поруч са службай у храме многа сіл прыкладаў для развіцця асветы на Гомельшчыне. Вылучаўся рознымі грамадскімі актыўнасцямі... Быў старшынёю Гомельскага брацкага саюза, членам мясцовага камітэта Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа. Неаднаразовы старшыня епархіяльных з'ездаў духавенства ў 1910-я гады. А яшчэ — член Савета Гомельскага таварыства цвярозасці, дабрачынны Гомельскай акругі, член Надзвычайнага епархіяльнага сходу духавенства і міран Магілёўскай епархіі, дэлегат Усерасійскага з'езда духавенства і міран у 1917 годзе. Узнагароджаны ордэнамі Святога Станіслава III ступені, Святой Анны III і II ступеняў. У 1923 годзе святар быў арыштаваны. У сакавіку 1924 года пакаяўся перад патрыярхам Ціханам. Змагаўся з абнаўленцамі, ініцыіраваў уз'яднанне духавенства Гомельскага павета з Патрыяршай Царквою. У 1929 годзе пазбаўлены выбарчых правоў. У 1930 годзе арыштаваны. Памёр у Бутырскім астрозе. Пахаваны на Ваганькаўскіх могілках у Маскве. Месца пахавання страчана з-за новых пахаванняў. Такія легендарныя асобы, несумненна, прыўносілі ў атмасферу храма, у атмасферу служэння ў Петрапаўлаўскім саборы ўсведамленне надзвычайнага дзейства.

...У 1935 годзе сабор быў закрыты. Службу ў ім узнавілі толькі ў 1940-я гады. Гэта супала з перыядам акупацыі Гомеля нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1960-х сабор закрылі паўторна. Пазней у ім абсталявалі планетарый...

І вось 14 жніўня 1989 года ў ЦК Кампартыі Беларусі ў сектар справаводства трапляе калектыўны ліст. Адрасаваны ён Народнаму дэпутату СССР, Першаму сакратару Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі Яфрэму Аляксеевічу Сакалову. Падпісанты — аўтарытэтныя і ў Беларусі, і ў Савецкім Саюзе асобы: Герой Сацыялістычнай Працы, старшыня Савецкага фонду культуры акадэмік Дзмітрый Ліхачоў, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўных прэмій СССР, першы сакратар Саюза пісьменнікаў РСФСР, акадэмік Акадэміі педагагічных навук Сяргей Міхалкоў, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР, народны артыст СССР Іван Казлоўскі, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Ленінскай прэміі, народная артыстка СССР Людміла Зыкіна, народны мастак СССР Ілья Глазуноў, старшыня Савецкага камітэта славістаў акадэмік Мікіта Талстой, народны дэпутат СССР, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, народны мастак СССР Міхаіл Савіцкі, Герой Сацыялістычнай Працы, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, народны пісьменнік БССР Іван Шамякін, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўных прэмій СССР, дэпутат Вярхоўнага Савета РСФСР, народны артыст СССР Сяргей Бандарчук, лаўрэат Ленінскай прэміі акадэмік Барыс Раўшэнбах, Герой Сацыялістычнай Працы, народны дэпутат СССР, народны пісьменнік БССР Васіль Быкаў, Герой Сацыялістычнай Працы, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, народны скульптар СССР (так у арыгінале! Трэба разумець: народны мастак СССР. — **Аўт.**) Заір Азгур, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, старшыня Беларускага фонду культуры Іван Чыгрынаў, лётчык-касманаўт СССР, двойчы Герой Савецкага Саюза Віталь Севасцьянаў, лётчык-касманаўт СССР, двойчы Герой Савецкага Саюза, народны дэпутат СССР Пётр Клімук, народная артыстка СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Людміла Касаткіна. Аўтарытэтная каманда!

Хутчэй за ўсё ініцыятарам гэтага звароту быў шаноўны Дзмітрый Ліхачоў. Аб чым жа просяць дзеячы савецкай культуры?..

«Шматпаважаны Яфрэм Яўсеевіч!

У пярэдадзень абвешчанага ЮНЕСКА міжнароднага святкавання 500-годдзя асветніка беларускага народа і кнігадрукара Францыска Скарыны і правядзення ў Полацку Усесаюзнага Дня славянскага пісьменства і культуры савецкая творчая інтэлігенцыя звяртаецца да Вас, шматпаважаны Яфрэм Яўсеевіч, з наступным.

У абласным цэнтры рэспублікі г. Гомелі цудам захаваўся адзіны ў Беларусі праваслаўны кафедральны Петрапаўлаўскі сабор, помнік архітэктуры пачатку XIX стагоддзя, былу ў падпарадкаванні Рускай Праваслаўнай Царквы і знаходзіўся ва ўзорным стане. 30 кастрычніка 1960 года было прынята рашэнне гарсавета «Пра выкарыстанне сабора па прамым прызначэнні і ўладкаванні ў ім планетарыя і маятніка Фуко». Не будзем каментаваць гэта рашэнне...» Нагадаем, што маятнік Фуко — гэта маятнік для эксперыментальнай дэманстрацыі сутачнага вярчэння Зямлі. Упершыню эфект прадэманстраваў Л. Фуко (1851 год). Зрабіць гэты маятнік не так складана... Невыпадкова сярод дзеючых маятнікаў Фуко ў свеце ёсць і маятнік, усталяваны ў гомельскай СШ № 69... Даўжыня — 12,5 метра. Вага — 60 кг. Усталявалі яго ў маі 2017 года... Выкарыстоўваць жа менавіта сабор дзеля гэтай, безумоўна, добрай навуковай справы — крута!..

Чытаем далей у звароце да Яфрэма Сакалова: «...Нядаўна спыніў па прычыне нерэнтабельнасці сваю дзейнасць і планетарый. Паўстала пытанне пра далейшы лёс сабора, і Гомельскі гарсавет прыняў рашэнне размясціць у помніку архітэктуры, гісторыі і культуры, у спрадвеку праваслаўным саборы — канцэртную залу арганнай музыкі. Такі намер, на вялікі жаль, нельга лічыць праваможным і добра прадуманым...» На той час яшчэ не існавала Гомельскай епархіі, адпаведна і адносіны ўлады — гарадской, абласной — з праваслаўнымі святарамі былі далёкімі. Дарэчы, і Магілёўская епархія, у якой болей як 45 гадоў перад гэтым была не занятай кафедра кіраўніцтва, толькі ў 1989 годзе атрымала свайго кіраўніка — архіепіскапа Магілёўскага і Мсціслаўскага Максіма. Гэта падчас яго кіравання адбылася кананізацыя свяціцеля Георгія (Каніскага) архіепіскапа Магілёўскага. Відавочна, ён і ініцыіраваў пытанне аб вяртанні царкве сабора ў Гомелі...

Чытаем далей: «Перадаваць культавыя будынкі нейкім арганізацыям варта толькі ў тых выпадках, калі іх нельга выкарыстоўваць па прамым прызначэнні. У дадзеным жа выпадку ў гарсавеце маюцца тысячы слёзных прашэнняў вернікаў вярнуць ім кафедральны сабор, да таго ж, абшчына вернікаў зарэгістравана адпаведнымі інстанцыямі.

Адкрыццё ў саборы канцэртнай залы не з'яўляецца найлепшым рашэннем, паколькі ўсталяванне аргана, якога там не было, прывядзе да скажэння інтэр'ера сабора. Арганная музыка заўсёды была неад'емнай часткай каталіцкай царквы, і, канешне ж, у праваслаўным саборы візантыйскага, а не гатычнага стылю арган будзе выглядаць і гучаць ненатуральна.

Акрамя таго, у горадзе з паўмільённым насельніцтвам болей мэтазгодна пабудаваць універсальную канцэртную залу, дзе магла б гучаць і класічная, і народная, і эстрадная музыка. Толькі такім чынам можна прыцягнуць слухачоў, асабліва моладзь, да мастацтва ва ўсім шматаблічны яго жанраў.

Спадзяёмся, што наспелае пытанне аб перадачы сабора рэлігійнай абшчыне, шматпаважаны Яфрэм Аляксеевіч, адпавядае духу сённяшняга часу, гэта значыць, з максімальнай увагай і павагай правоў вернікаў жыхароў Гомеля».

7 верасня 1989 года Першы сакратар ЦК КПБ Яфрэм Сакалоў накладвае рэзалюцыю: «Камаю А. С. ... Трэба пайсці насустрач вернікам».

Гомельскі абкам КПБ рэагуе ў адпаведнасці з пастаўленай задачай. І ўжо сакратар абкама А. Камай дакладвае ў ЦК: «...Паведамляем, што 26 верасня г.г. сесія Гомельскага гарадскога Савета народных дэпутатаў прыняла рашэнне пра перадачу будынка Петрапаўлаўскага сабора ў бясплатнае карыстанне другому рэлігійнаму таварыству Рускай праваслаўнай царквы ў адпаведнасці з усталяваным законам парадкам.

Пра дадзенае рашэнне дасланы адказ старшыні Савецкага фонду культуры т. Ліхачову Дз. С.»

Ужо і ўрад падключыўся да справы. У часткцы справаздачы... Намеснік Старшыні Савета Міністраў Беларускай ССР Н. Мазай... Вось што яна піша сакратару ЦК КПБ М. Ігрунову: «Па Вашым даручэнні ў Савеце Міністраў БССР разгледжана пісьмо групы адметных гармадскіх дзеячаў краіны пра перадачу вернікам праваслаўнага Петрапаўлаўскага кафедральнага сабора ў г. Гомелі.

У сувязі са шматлікімі калектыўнымі зваротамі ў розныя інстанцыі праваслаўных вернікаў г. Гомеля, а таксама адкрытым лістом групы дзеячаў навукі і культуры на імя Першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі т. Сакалова Я. Я. сесія Гомельскага гарадскога Савета народных дэпутатаў 26 верасня 1989 г. разгледзела гэта пытанне і прыняла рашэнне перадаць будынак сабора зарэгістраванаму таварыству рускай праваслаўнай царквы ў бясплатнае карыстанне на ўмовах і ў парадку, прадугледжаным Палажэннем аб рэлігійных арганізацыях, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларускай ССР.

Пра прынятае рашэнне старшыні Савецкага фонду культуры акадэміку Дз. С. Ліхачову паведамлена».

Кропка ў складаным пытанні была пастаўлена. Канешне ж, паўплываў на гэта і час. Але відавочным падаецца і іншае: зварот, ініцыіраваны Дзмітрыем Ліхачовым, паспрыяў паскарэнню працэсу...

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

Згадваем і ганарымся

# АДЗНАЧАЕМ РАЗАМ

## да юбілею класіка

вайны, візуальна пацвярджаючы тое, аб чым Янка Купала пісаў.

А ўвечары ў Купалавым доме адбудзецца Купальская ноч — мерапрыемства з інтэрактыўнай праграмай і элементамі рэканструкцыі традыцыйнага свята. Ладзім мы яго сумесна з Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў.

У гэтым годзе мы згадваем і трагічную дату — 80 гадоў з дня смерці Янкі Купалы. «Жальбіны» ў памяць паэта пройдуць 28 чэрвеня на Вайсковых могілках.

### У філіялах музея

— Не застануцца ўбаку і нашы філіялы — 2 ліпеня ў Купалаўскім мемарыяльным запаведніку «Ляўкі» адбудзецца свята паэзіі «Купала заўсёды ў сэрцы маім». А 9 ліпеня ў Вязынцы пройдзе рэспубліканскае свята паэзіі, песні і народных рамёстваў «З адною думкаю аб шчасці Беларусі», куды будуць запрошаны паэты, спевакі і народныя мастацкія калектывы.

Напрыканцы ліпеня плануем правесці сяброўскую сустрэчу ў Смольні, каб адзначыць 110-годдзе з дня знаёмства Янкі Купалы і Якуба Коласа. Праект з нашым удзелам рыхтуе Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа. Сачыце, калі ласка, за навінамі музея — мы абавязкова абвесцім аб правядзенні свята.

### Сумесныя праекты

— Трэба дадаць, што ўвесь юбілейны 2022 год багаты на розныя сумесныя выставачныя і культурна-адукацыйныя праекты. Якраз у маі адбылося адкрыццё выстаўкі «Янка Купала і Якуб Колас. Досціпы ад класікаў». Праект быў зладжаны сумесна з Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеем Якуба Коласа. Вельмі цікавая выстаўка, бо ўпершыню была паказана адметная рыса характараў народных паэтаў — іх стаўленне да гумару і сатыры як у творчасці, так і ў жыцці. Таму запрашаем наведвальнікаў: выставачны праект «Досціпы ад класікаў» будзе працаваць да 30 ліпеня.

Хацелася б адзначыць культурна-адукацыйны праект «Купала. 12 адкрыццяў», які штомесяц ладзяць навуковыя супрацоўнікі музея, кожны з якіх прадстаўляе гасцям музея свайго Купалу, знаёмячы з малавядомымі старонкамі жыцця паэта, у новым святле паказваючы яго асобу і творчасць. Таксама мы арганізоўваем праект «Слухаем класіка», які ў рамках акцыі «Чытаем Купалу разам» ладзіцца сумесна з каналам «Культура» Беларускага радыё. Супрацоўнікі музея рыхтуюць літаратурную давядку пра абраны для чытання твор, а агучваюць яго вядомыя акцёры вядучых драматычных тэатраў краіны.

Мы імкнёмся захоўваць добрыя традыцыі, закладзеныя папярэднікамі, але адгукаемся на змены, якія нясе час. Таму мы павінны не толькі забяспечыць высокі ўзровень адукацыйных і інфармацыйных паслуг, але і актыўна далучаць моладзь і сямейную аўдыторыю да нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны праз прызму жыцця і творчасці Янкі Купалы.

**Арына КАРПОВІЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Рубежевичи» (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ БАНИ

***(составные части и принадлежности: сарай),*** **инв. № 622/С-45990 общей площадью 152,8 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625484806101000178 площадью 0,0847 га** ***(право аренды по 19.12.2066)*** **по адресу: Минская область, Столбцовский район, Рубежевичский с/с, д. Новые Рубежевичи, ул. Лесная, 1А.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона рек и водоемов (ручей № 2, река Сула), пл. 0,0847 га, прибрежная полоса ручья № 2, пл. 0,0040 га, охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0019 га, охранная зона объектов газораспределительной системы, пл. 0,0018 га.*

*Объект обременен договором аренды с ОАО «Белхим» по 31.12.2022 г.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **25 497,22** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **2 549,72** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB3012108260016 9330000 в ОАО «Сбер Банк»,г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **15.07.2022** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.07.2022** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра: (801717) 35-773, 8 (044) 791-04-02.**

УНН 600022457

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** ***(организатор аукциона)*** **по поручению открытого акционерного общества «Стародорожский райагросервис»** ***(продавец)*** **проводит открытый аукцион по продаже**

## ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

